МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН. ТУТ
СОВ. СТРОИТ. И ПРАВА
1.12 ЗВ 2

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 91 (5765) | 20 красавіка 1937 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ «ПРАВДЫ» — Па-сапраўднаму кіраваць выбарамі парторганаў!

І. Александраў — Націск германскага фашызма на паўднёвы ўсход.

Е. Бутомаў, С. Галкін — У атмасферы бесклапотнасці.

П. Леў — Торфасезон сустрэлі непадрыхтаванымі.

Арк. Зарубежны — Карысны пачын.

Офенгейм — Уноў абранымі парторганамі гарком не кіруе.

В. Раманоўскі — Аб памылках райкома нічога не сказана.

План пасеву яравых па БССР выкананн на 15 красавіка толькі на 10,3 процанта.

ЗА РУБЯЖОМ:

Узлым антыфашысткага руху ў Германіі;

Змова румынскіх фашыстаў;

Адпраўка італьянскіх часцей у Іспанію;

Пісьмо генерала Міяха мадрыдскім комуністам.

Тэрарыстычная дзейнасць чэхаславацкіх гітлераўцаў.

ПА-САПРАЎДНАМУ КІРАВАЦЬ ВЫБАРАМІ ПАРТОРГАНАЎ!

Яркім, поўнакроўным жыццём жыве наша партыя. Рашэнні Пленума ЦК ВКП(б), даклад і заключнае слова таварыша Сталіна ўзброілі партыйныя арганізацыі і кожнага комуніста для выканання гіганцкіх задач, устаўшых перад партыяй у сувязі з палітычным паваротам у нашай краіне. Выбары партыйных органаў знамянуюць пачатак рашучай перабудовы партыйнай работы, далейшага ўмацавання кіруючай ролі нашай партыі, узмацнення яе магутнасці, сілы і згуртаванасці.

Надзвычай раласным з'яўляецца факт вялікай палітычнай актыўнасці і свядомасці комуністаў на выбарах. Па выбарачных даных, у Маскве з 38.371 прысутнічаўшых на партыйных сходах выступіла ў спрэчках па справаздачах парткомаў 20.519 чалавек, апрача таго 18.155 чалавек выступіла пры абмеркаванні кандыдатур. Тое-ж самае ў Ленінградзе, дзе 70—80 процантаў усіх прысутнічаўшых на сходах удзельнічала ў спрэчках. Такая-ж, дагэтуль нябачаная, актыўнасць наглядаецца амаль паўсямесна.

Неапаніма значэнне тайнага галасавання кандыдатур, прадастаўляючага неабмежаваную свабоду членам партыі ў выбары сваіх кіраўнікоў. Узрослая палітычная актыўнасць і высокая свядомасць комуністаў з'яўляюцца асноўнай гарантыяй таго, што пяцер унутрыпартыйная дэмакратыя і большэвіцкая самакрытыка — гэтыя родныя сёстры — увойдуць у плоць і кроў кожнай партыйнай арганізацыі.

Выбары парторганаў пярвічных арганізацый заканчваюцца. Яны праходзяць у абстаноўцы разгорнутай крытыкі недахопаў работы, стараннага абмеркавання кожнай кандыдатуры, у абстаноўцы найшырэйшай дэмакратыі. У пераважнай большасці арганізацый выбіраюць у партыйныя органы самых лепшых і адданых Цэнтральнаму Камітэту партыі людзей, маючых найбольшыя сувязі з масамі, найлепшае «імя» сярод комуністаў. Цяпер гэтым большасць ранейшых сакратароў і парторгаў выбрана нанава. Так, у Маскве, па выбарачных даных, з 1.258 выбраных сакратароў парткомаў 854 старых, з 1.511 нанава выбраных парторгаў 1.022 былі парторгамі раней. Гэта факт знамянальны. Ён сведчыць аб сіле і аўтарытэтнасці партыйнага апарата, аб устойлівасці асноўных партыйных кадраў, аб іх растучай палітычнай і дзелавой кваліфікацыі.

Нямала, зразумела, людзей вылепела з партыйнай цяжкі, абанкропілася. Але партыя наша моцна глыбінёй сваіх крыніц. Замест абанкроціўшыхся, прагніўшых, самасупакоіўшыхся работнікаў партыйныя арганізацыі вылучылі новыя, вырасшыя кадры, сотні, тысячы людзей, да канца адданых партыі, якія авалодваюць большэвізмам, найшырэйшымі нітямі звязаных з масамі.

Зараз партыйныя арганізацыі ўступаюць у новы адказны перыяд. Побач з выбарамі ў пярвічных арганізацыях пачаліся раённыя партыйныя сходы і канферэнцыі. Яшчэ і яшчэ раз прыходзіцца напамінаць райкомам, гаркомам і абкомам, што выбарамі трэба па-большэвіцку кіраваць, перасякаючы ў корані ўсякае, няхай незначнае, парушэнне пастановы ЦК аб арганізацыі выбараў.

Між іншым, калі гаварыць аб адмоўных уроках праходзячых выбараў, то галоўны з іх заключаецца ў тым, што многія партыйныя органы самаўхіліліся ад гэтай важнейшай справы, праяўляюць абураючую бесклапотнасць да падбору і размеркавання партыйных кадраў. Яркім прыкладам гэтага можа служыць Чэлябінскі абком, які фактычна ўхіліўся ад кіраўніцтва выбарамі, праставіўшы ўсю справу самацёку. Па заяве загалчыка аддзелам кіруючых парторганаў абкома тав. Абаляева, у Чэлябінску рашылі не даваць ніякіх указанняў райкомам. Там усё кіраўніцтва выбарамі абмежавалі канстатацыяй фактаў парушэнняў пастановы ЦК, пісаннем зводак.

Атмасфера чыннага супакою і бесстароннасці, што пануе ў абкоме, распаўсюджваецца і на мясцовыя арганізацыі. Так, сакратар Златаўсцінскага гаркома тав. Апасаў прасядзеў некалькі дзён на сходзе партарганізацыі інструментальнага завода і не прараніў ні адзінага слова. Гэты старонні наглядальнік не падняўся на трыбуну нават тады, калі аказалася, што ў новы склад парткома не выбралі ні аднаго нізавога партыйнага работніка, ні аднаго комуніста-рабочага.

Факты падобнага роду не адзінкавы. Яны маюць месца не толькі ў Чэлябінскай вобласці. Нажаль, яшчэ нямала такіх партыйных работнікаў, якія імкнуцца самаўхіліцца ад выбараў, прычым наіўна разважаюць так: «Няхай робяць што хочуць, няхай выбіраюць, каго хочуць, — абы мяне не чапалі». Такія кіраўнікі выдаюць сябе з галавой. Яны або працаўнікі ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, або проста палітычныя трусы. Яны забываюць, што кіруючым арганізацыйным прынцыпам пабудовы нашай партыі з'яўляецца дэмакратычны цэнтралізм.

Гэты прынцып, як вядома, азначае не толькі выбарнасць усіх кіруючых органаў партыі, але і безумоўную абавязковасць рашэнняў вышэйшых органаў для ніжэйшых, для ўсіх членаў партыі. Прамы абавязак вышэйстаячых партыйных органаў — кіраваць ніжэйстаячымі, накіроўваць іх работу, і гэты абавязак не злымаецца, а павялічваецца ў сто раз у часе выбараў. Прамы абавязак партыйных органаў — размяркоўваць кадры, рэкамендаваць таго ці іншага таварыша на кіруючую работу, зорка ахоўваць партыйны апарат ад пранікнення ў яго трацкістаў, правых, прыміранцаў і абывацеляў. Прамы абавязак партыйных камітэтаў — строга сачыць за выкананнем рашэнняў ЦК ВКП(б), узначальваць і накіроўваць па правільнаму руслу самакрытыку. Калі ўнутрыпартыйную дэмакратыю разумець так, як у Чэлябінску, то ёсць небяспека страціць кіраўніцтва партыйнымі арганізацыямі.

Наша партыя ніколі ні фетышавала дэмакратыю, тым больш ніколі не падмяняла рэвалюцыйную метазгоднасць фармальным дэмакратызмам. Прыходзіцца проста здзіўляцца, што некаторыя арганізацыі, часамі вельмі аўтарытэтныя, асляпленыя фармальным дэмакратызмам, суткі, а то і двое выбіраюць прэзідыум, праседжваюць ночы напралёт, зрываючы пармальны ход вытворчасці. Каму патрэбна такая неарганізаванасць?

Трэба ўлічыць усе памылкі, дапушчаныя пры выбарах парторганаў пярвічных арганізацый, і, пазбегнуць іх пры правядзенні раённых канферэнцый і сходаў. Значэнне раённых цэнтраў агульнавядома. Створаныя па ініцыятыве таварыша Сталіна, яны з'яўляюцца асноўным звяном социялістычнага будаўніцтва, і не толькі адміністрацыйным і эканамічным, але культурным і палітычным цэнтрам.

У раёнах сканцэнтраваны значныя кадры нашай партыі. Перад райкомамі стаяць вялікія задачы і партыйнага і гаспадарчага будаўніцтва. Было-б зусім ненармальна, школна лічыць, што выбары раённых камітэтаў і правядзенне раённых канферэнцый — справа больш простая, чым выбары ў пярвічных арганізацыях. Наадварот, значэнне раёнаў настолькі вялікае, што ўсякая малейшая памылка, парушэнне ўказанняў ЦК, малейшае аслабленне кіраўніцтва можа нанесці выключную шкоду.

Неабходна добра падрыхтавацъ канферэнцыі, шырока разгарнуць самакрытыку і праверкай знізу ўскорыць усе недахопы партыйнай работы. Няхай голас самакрытыкі, голас дэлегатаў яшчэ мацней гучыць з трыбун раённых канферэнцый! Няхай яшчэ шырэй дзеляцца дэлегаты каштоўнейшым вопытам будаўніцтва, які масы накапляюць з дня на дзень!

Самае галоўнае, вядома, выбраць палітычна адданых і дзелавых людзей у раённыя камітэты, кіруючыя большэвіцкімі прынцыпамі падбору кадраў. Для гэтага трэба па-большэвіцку кіраваць выбарамі, не аслабляць кіраўніцтва партыйнымі арганізацыямі. Раённы работнік, адданы да канца партыі, павінен уладаць перш за ўсё пільнасцю, рашучасцю і бесстрашнай цвёрдасцю ў барацьбе з ворагамі працоўнага народу. Гэту рысу, кроўна ўласнівую большэвікам, ніколі не трэба забываць. Большэвік-кіраўнік павінен умець арганізаваць масы, трымаць з імі пастаянную сувязь, вучыць і выхоўваць іх. У гэтым — крыніца перамог нашай партыі.

„Правда"

Разгортваць социялістычнае спаборніцтва на калгасных палях

У калгасе «Савічы», Брагінскага раёна, у перадавой па сяўбе брыгадзе № 3 наладжана рэгулярная чытка газет у абедзены перапынак. НА ЗДЫМКУ: чытка ў брыгадзе газеты «Правда».
Фото Цалуйка (БСФ).

У ПАЛОНЕ ШКОДНЫХ РАЗВАЖАННЯЎ

Калгасы Смілавіцкага раёна працуюць на палях ужо каля двух тыдняў. За гэты час падрыхтавана дастаткова глебы пад яравыя культуры. Веснавое ворыва праведзена на плошчы ў 1.952 гектараў. Але з сяўбой у Смілавічах не спяшаюцца. На 15 красавіка засеяна ўсяго 226,3 гектараў яравых. У тым ліку 38 гектараў ішанцы, 27 гектараў ячменю і 101 гектар аўса. У наяўнасці вялікі разрыў паміж апрацоўкай глебы і сяўбой.

К прыкладу, у калгасе імя Дзержынскага, Карауноўскага сельсавета, падрыхтавана пад яравыя культуры каля ста гектараў. Засеяна ўсяго 15 гектараў ільну. Зернавыя-ж культуры пакуль што сеяць не збіраюцца.

— Хаця-б не пахаладала, няхай лепш падсохне зямля, — апраўдваецца старшыня калгаса Шыдлоўскі. Нават агранам райземаддзела Каспяровіч яшчэ не раіў сеяць. Пачакаем, пакуль не будзе распускацца ліст на дрэвах. Ні ў адным калгасе не разгорнута социялістычнае спаборніцтва за своечасовае і добраякаснае правядзенне веснавой сяўбы, за сталінскі ўраджай.

З дня на дзень сяўба ў калгасе адкладаецца. Хаця надвор'е ў поўнай меры спрыяе разгортванню масавай сяўбы, але тут усё яшчэ чакаюць большага цацяплення і спасылаюцца па розныя «аб'ектыўныя» прычыны.

Розныя спасылкі для апраўдання бяздзейнасці можна пачуць ва ўсіх калгасах Смілаўшчыны. Большасць калгасаў зусім не пачалі сеяць. У Смілавіцкім, Голацкім, Дукорскім, Сяргеевіцкім і іншых сельсоветах да гэтых дзён не засеяна ні аднаго гектара. У Дудзіцкім сельсавеце засеян толькі... 1 гектар ішанцы.

Усюды адны настроі, што нібыта мокра, нельга сеяць. Старшыня калгаса «Большэвік», Сяргеевіцкага сельсавета, Макаравіч наадрэз адмаўляецца сеяць. Становішча, між іншым, такое, што праз некалькі дзён сеяць ужо будзе позна. Такое становішча і ў калгасе імя ЦВК БССР, Дукорскага сельсавета. Старшыня гэтага сельсавета Краснагіра адкладае сяўбу да канца месяца. Тут-жа, як і ў астатніх месцах, ёсць усе магчымасці сеяць без ніякай затрымкі.

У калгасах імя Сталіна, «Новы Груд», «Чырвоны партызан» работа на полі пачынаецца ў 9—10 гадзін; працуюць у дзень па 7—8 гадзін, астатні час прагульваюць. Адсюль становішча зразумелым, чаму такія нізкія тэмпы не толькі сяўбы, але і апрацоўкі глебы. Калгас «Чырвоны партызан» за два тыдні падрыхтаваў для пасеву толькі 20 гектараў, а пра сяўбу тут яшчэ нават і не думаюць.

Многія калгасы знаходзяцца на повадзе адсталых аграномаў, якія арыентуюць іх на позную сяўбу яравых. Той-жа агранам, Каспяровіч, не толькі ў адным калгасе імя Дзержынскага раіў пакуль што з сяўбой устрымацца. Апошнія дні ён знаходзіцца ў Дукорскім сельсавеце, дзе калгасы не засеялі ні аднаго гектара. Каспяровіч нічога не зрабіў для ліквідацыі такога становішча.

Аграномы не дапамагаюць калгасам ні парадай, ні справай. Іх не знойдзеш на полі, у калгасе, у брыгадзе. Затое самі калгаснікі прыходзяць у райземаддзел, шукаюць іх па ўсяму мястэчку. Клапаўшчык калгаса імя Дзержынскага Лухверчык два дні патраціў на пошукі агранома, каб той указаў, як трэба пратручваць насенне. За растлумачэннем правіл пратручвання насення прыходзяць у райземаддзел дзесяткі калгаснікаў, але ўсё без вынікаў. Таму ў раёне першыя гектары зернавых засеяны непратручаным насеннем, зусім не скарыстоўваюцца сеялкі.

Райземаддзел самаўхіліўся ад кіраўніцтва сяўбой. Характэрна, што загалчык райземаддзела Гукайла ні разу не быў у калгасах, не палічыў патрэбным нават папікавіца, чаму калгасы не сеюць. Наадварот, ён прытрымліваецца старых, дзедаўскіх звычаяў — што сеяць рана, трэба пачакаць. Ніякіх нават указанняў аб разгортванні сяўбы ў калгасах не даў райземаддзел.

Тое-ж можна сказаць пра райком КП(б)Б і райвыканком. Сакратар РК тав. Плятнёў, загалчык сельгасаддзела РК тав. Блаўштэйн і старшыня РВК тав. Жукоўскі таксама знаходзяцца ў палоне разважанняў: «сеяць, ці не сеяць?» А калгасы прытрымліваюцца гэтага і, чакаючы ад раённых кіраўнікоў распараджэння, зацягваюць сяўбу яравых.

А. ЛОСЬ.

Ход сяўбы яравых па раёнах БССР на 15 красавіка 1937 года ў проц.

Раёны	Усяго пасеяна яравых	У тым ліку пасеяна збожжавых	З іх: Пшаніцы	З іх: Ячменю	З іх: Аўса	Ільну	Падсеўных травяных	З усяго пасеву збожжа яравых пасеяна: Праніклаванным насеннем	Спартаным насеннем	Радковай сеўбой	Узарана весняга ворыва (га.)
Камарынскі	39,9	59,8	101,1	108,5	88,7	57,7	38,8	60,3	80,8	48,8	4504
Тураўскі	35,7	60,0	102,6	94,2	86,8	14,5	36,5	100,0	79,1	42,6	850
Лоеўскі	31,1	46,8	92,2	89,6	81,0	36,3	24,9	91,7	60,5	10,4	5394
Брагінскі	30,0	59,4	86,9	84,7	70,1	18,2	52,6	50,7	42,1	21,5	4657
Даманавіцкі	29,5	50,7	84,7	70,7	91,3	24,3	46,4	62,7	72,2	11,4	4458
Жыткавіцкі	27,8	42,7	94,7	39,5	76,7	7,4	23,0	100,0	52,5	15,6	3084
Лельчыцкі	27,1	28,2	83,9	66,0	81,3	60,0	58,4	45,1	75,9	17,8	3488
Петрыкоўскі	26,3	41,6	86,6	74,9	86,6	28,3	27,0	48,7	43,4	12,0	1816
Нараўлянскі	26,3	38,6	84,4	83,8	79,1	22,8	43,9	28,0	76,9	20,0	4990
Капаткевіцкі	26,0	42,2	89,1	76,1	76,5	34,3	46,6	—	70,0	16,9	1160
Мазырскі	24,3	44,6	79,6	69,1	83,9	10,9	38,1	100,0	49,9	12,2	6134
Хойніцкі	23,9	47,3	68,9	72,3	47,4	3,7	18,6	100,0	47,2	16,5	6373
Грэскі	23,1	46,0	72,8	74,7	63,8	12,6	50,2	37,3	41,0	10,6	768
Ельскі	22,8	35,7	81,2	58,3	86,5	21,2	43,1	20,0	46,1	8,3	4461
Добрушскі	22,0	38,7	46,3	53,8	58,6	4,7	36,0	—	—	24,2	740
Веткаўскі	20,1	43,9	71,3	76,9	48,5	8,0	55,3	29,8	49,4	16,9	1752
Свяцілавіцкі	19,4	37,3	78,0	67,0	52,8	3,1	44,0	11,0	46,7	3,5	2780
Чачэрскі	19,1	35,1	74,9	73,9	34,5	19,3	47,6	78,0	30,4	10,0	2861
Парыцкі	18,4	32,1	[illegible]	[illegible]	46,9	2,1	18,1	100,0	32,2	9,6	5686
Чашніцкі	18,4	19,1	26,7	4,6	22,7	55,7	87,6	8,7	0,1	0,4	5224
Жыравіцкі	17,6	34,8	61,5	75,6	19,7	5,8	43,6	36,4	45,9	13,8	4520
Будакашалёўскі	17,5	31,7	50,2	55,3	21,2	6,4	40,7	100,0	37,6	22,1	3212
Чырвонаслабодскі	17,4	27,2	30,0	—	65,1	12,1	25,7	43,4	26,3	3,4	1452
Глускі	16,0	28,4	54,5	34,3	39,9	—	9,2	100,0	29,3	8,9	4360
Кармянскі	15,8	30,4	52,2	61,9	15,8	0,7	30,1	—	34,0	6,0	4200
Бабруйскі	15,7	25,6	50,6	23,3	27,5	2,2	18,4	73,3	29,0	6,7	3405
Аршанскі	15,6	20,9	22,5	23,3	20,4	48,2	44,2	11,3	19,9	1,8	4655
Рэчыцкі	15,0	39,8	60,1	49,3	31,8	1,4	13,9	100,0	36,3	8,0	5102
Гомельскі	14,7	23,9	41,5	33,7	27,1	5,0	53,6	33,2	34,7	20,4	1405
Жлобінскі	14,3	28,1	42,5	42,9	27,3	2,0	50,6	7,8	18,8	—	5763
Рагачоўскі	13,8	24,6	31,4	43,8	25,5	3,7	37,6	78,0	30,2	17,7	2994
Церахоўскі	13,7	24,2	54,9	48,9	20,6	10,8	42,4	62,4	27,6	8,2	3605
Старобінскі	13,5	20,3	60,7	2,0	26,7	35,8	35,3	72,4	16,5	3,8	3018
Касцюковіцкі	12,5	23,6	56,3	56,5	7,4	5,8	39,2	34,1	7,0	1,5	3531
Бялыніцкі	12,2	20,1	38,7	37,7	7,1	14,5	20,0	60,0	22,2	—	6170
Мсціслаўскі	12,0	21,5	20,2	54,8	10,2	9,3	55,1	16,6	24,1	3,0	6398
Сенненскі	11,2	11,5	22,2	11,3	8,2	31,3	67,5	21,0	10,8	—	3244
Чырвонапольскі	11,1	20,3	39,0	38,2	7,6	1,1	43,8	27,8	9,3	0,7	4907
Чэрыкаўскі	10,5	18,7	17,2	52,1	10,3	0,9	41,7	—	21,0	0,8	2282
Кіраўскі	10,4	18,9	30,0	30,8	12,0	2,8	19,4	16,7	17,9	1,5	5469
Прапойскі	10,4	18,3	43,8	39,8	5,8	0,5	29,1	—	17,3	4,1	2811
Быхаўскі	10,3	19,0	25,3	42,0	4,1	0,4	26,4	59,3	13,6	1,7	4193
Старадарожскі	10,0	17,3	40,9	8,8	23,6	1,1	13,8	—	6,3	—	2680
Магілеўскі	9,7	16,6	16,3	23,3	14,1	10,8	29,3	36,6	13,5	0,3	5781
Дрыбінскі	9,5	14,6	17,5	31,7	7,2	14,3	39,3	5,8	11,1	1,1	16368
Клімавіцкі	9,2	17,2	24,6	40,6	3,3	3,9	60,5	66,1	13,1	3,4	3477
Ушацкі	8,8	13,0	6,2	2,7	15,2	15,9	86,1	9,0	3,7	—	6402
Уваравіцкі	8,6	17,1	32,2	38,1	6,9	1,4	23,8	—	11,7	4,1	3011
Крычаўскі	8,1	17,2	11,7	44,1	12,0	0,8	44,2	4,7	16,4	2,0	1809
Любаньскі	8,1	13,2	26,3	7,4	14,5	2,3	9,3	57,4	4,5	3,0	1836
Шклоўскі	8,1	5,6	3,8	5,0	6,2	29,5	39,3	4,8	6,3	0,8	7794
Капыльскі	8,0	15,8	22,8	6,5	22,1	0,8	19,7	76,9	10,8	2,6	1363
Чавускі	8,0	13,7	22,8	33,5	3,2	3,5	39,3	9,3	15,2	—	5438
Талачынскі	7,2	3,3	4,1	3,9	2,3	39,6	23,0	5,0	—	0,2	4319
Слупкі	7,0	10,2	31,9	1,6	13,5	4,5	13,2	79,7	9,3	4,1	4673
Бешанковіцкі	6,8	12,1	17,5	6,6	13,1	4,2	80,7	15,0	7,3	—	4468
Удзенскі	6,8	9,3	15,0	10,0	7,1	2,0	9,4	8,6	4,7	1,0	4190
Бярэзінскі	5,9	9,9	11,8	11,4	8,5	2,4	2,5	7,3	6,1	—	6032
Хоцімскі	5,4	10,5	9,6	26,9	5,4	—	27,4	6,0	13,3	1,7	1562
Клічаўскі	5,2	9,5	19,7	11,9	4,4	0,9	3,2	—	—	—	3088
Дубровенскі	5,2	4,4	6,3	2,2	4,4	15,9	44,7	—	4,5	—	5576
Асіпавіцкі	4,9	9,0	24,3	7,7	0,7	1,9	10,1	4,7	6,9	—	2968
Горацкі	4,9	8,0	16,1	15,1	1,7	4,0	40,4	2,4	11,7	0,3	5638
Круглянскі	4,8	5,1	4,0	5,4	4,3	15,2	17,5	—	—	—	4976
Лепельскі	4,7	7,5	6,9	1,4	6,4	8,7	78,9	5,3	2,9	—	3852
Віцебскі	4,2	8,5	12,4	9,9	7,5	0,5	103,3	—	—	—	2653
Плешчаніцкі	3,8	6,7	10,5	5,3	1,8	0,3	20,0	5,0	—	—	2433
Бягомльскі	3,7	6,2	10,5	2,9	2,5	1,3	35,2	—	1,3	—	3649
Ветрынскі	3,5	6,3	1,9	1,3	8,2	1,8	59,2	7,4	2,3	—	3611
Смілавіцкі	3,4	2,9	2,0	1,0	2,1	13,3	2,2	8,0	1,1	—	1952
Мехаўскі	2,6	5,0	8,8	5,3	1,2	0,4	61,9	31,7	3,5	0,2	2631
Халопеніцкі	2,6	4,8	13,4	3,2	1,9	0,9	38,1	27,0	1,3	—	6058
Багушэўскі	2,3	3,8	8,7	4,3	0,8	2,6	44,9	10,6	3,8	0,3	2700
Пухавіцкі	2,3	3,6	6,0	—	3,7	4,1	7,0	2,4	2,9	0,5	2288
Дзержынскі	2,3	3,6	0,9	0,1	3,2	0,3	24,1	—	1,2	0,3	2477
Заслаўскі	2,1	3,6	0,2	0,2	1,9	0,1	50,1	—	0,6	0,3	1420
Полацкі	2,0	4,1	0,7	0,5	1,6	0,2	54,0	—	1,7	0,4	2529
Дрысенскі	1,9	3,9	4,0	2,6	4,2	—	89,9	—	2,7	2,1	3106
Чэрвеньскі	1,9	3,1	7,7	5,7	0,9	3,5	1,6	6,7	0,1	—	2554
Крупскі	1,7	3,3	7,5	3,3	2,4	—	28,6	13,3	2,2	0,2	5878
Лагойскі	1,7	2,5	2,5	0,7	0,7	2,9	10,8	—	1,0	—	2455
Смалявіцкі	1,5	2,3	1,6	2,5	1,7	1,6	—	0,8	0,6	—	2544
Барысаўскі	1,1	1,9	3,4	0,9	0,9	0,2	10,3	—	2,0	2,2	3450
Гарадоцкі	0,9	1,8	1,2	1,0	0,9	0,1	69,3	6,3	0,8	—	2627
Менскі	0,9	1,2	0,2	0,2	1,4	0,9	8,1	—	—	—	1279
Сіроцінскі	0,8	1,5	0,8	0,8	1,7	0,4	79,5	—	—	—	2439
Расонскі	0,7	1,4	—	—	3,2	—	71,2	—	—	—	2263
Лёзнянскі	0,7	1,2	1,8	2,7	0,2	0,4	66,1	—	—	—	3491
Суражскі	0,4	0,9	0,5	0,9	0,6	—	17,5	1,8	—	—	321
Асвейскі	0,4	0,8	—	—	1,1	0,1	70,0	—	—	—	1018
Па БССР:	10,3	17,1	26,8	25,3	15,2	9,5	40,2	32,8	15,8	5,4	332663
Было на 10/IV 1937 года:	3,7	6,7	9,7	9,8	6,3	1,5	28,2	13,8	5,8	2,1	193686
Пасеяна соўгасамі НКС:	10,6	16,1	17,3	17,4	19,9	—	25,6	—	—	—	1858
Разам па БССР з соўгасамі НКС:	10,3	17,1	26,8	25,1	15,2	9,5	38,2	32,8	15,8	5,4	334521

Учотна-статыстычны аддзел НКЗБ.

Вынікі добрай падрыхтоўкі

З 10 красавіка пачаў масавую сяўбу калгас імя Валковіча, Бабруйскага раёна. У калгасе праведзена добрая падрыхтоўчая работа: своечасова вывезен гной, падрыхтавана насенне, пягавая сіла, інвентар.

Паміж брыгадамі і звяннямі разгорнута социялістычнае спаборніцтва. З першыхжа дзён перавыконваюць нормы на ворыве і баранаванні калгаснікі Мікола Капуспін, Анупрэй Капуспін, Рыгор Шчыгальскі, Ігнат Рафалёнак. Яны з'яўляюцца ініцыятарамі стахаўскага руху ў калгасе.

Калгаснікі настойліва змагаюцца за высокую якасць палявых работ, за сталінскі ўраджай.

А. АЎЧЫНІК.

Стахаўцы калгасных палёў

Калгас «Трэці рашаючы», Кавалеўскага сельсавета, Бабруйскага раёна адным з першых скончыў сяўбу зернавых культур. Сяўба праведзена высокаякасна.

У часе сяўбы ў калгасе выраслі новыя стахаўцы. Калгаснікі Крычка Пятро, Куксёнак Ілья, Куманёк Янка, Сакун Якуб, Куманёк Пятро, Мельнічонак Спірдон штодзённа перавыконвалі нормы выпрацоўкі на сяўбе на 300—400 проц.

Зараз калгас прыступіў да пасадкі бульбы.

М. ПУХАЛЬСКІ.

***

У Кармянскім раёне арганізавана шмат стахаўскіх звенняў, якія на палявых работах змагаюцца за высокі ўраджай.

Стахаўскія звенні калгаса «Іскра», Курганіцкага сельсавета, узялі абавязацельства атрымаць у гэтым годзе на асобных участках 600—800 цэнтнераў бульбы, 40 цэнтнераў збожжавых і 7 цэнтнераў ільновалакна. Такія-ж абавязацельствы ўзяты асобнымі звеннямі калгасаў «Новы прасвет», «Чырвоны дабраволец», Струкачоўскага сельсавета.

Пашыраецца стахаўскі рух і сярод трактарыстаў МТС. Трактарная брыгада Вары Ушавы, якая спаборнічае з брыгадай Соні Рачок, Копыльскай МТС, паставіла перад сабой задачу — дабіцца выпрацоўкі ў гэтым годзе на кожны трактар 1.500 гектараў.

І. КАВАЛЁЎ.

СТАХАНАЎСКІЯ ПЕРАМОГІ

За 16 дзён красавіка каваль 6-га аклодка 8-й дыстанцыі шляху (ст. Менск, Зах. чыгункі) ордэнаносец Павел Якаўлевіч Сабіла выканаў 2,5 месячнай нормы. Дзённае выкананне нормы ў Сабіла ніжай 340 проц. не бывае.

***

Рабочыя скурана-галантарэйнай фабрыкі імя Куйбышэва (Менск) адзначаюць падрыхтоўку да Першага мая стахаўскай работай цэлых брыгад.

14 красавіка брыгада т. Аніфатава выканала сваё заданне на 263 проц., выпусціўшы за дзень 888 рукзакаў, пры заданні ў 337 штук. Дакладнае заданне брыгада выканала на 224 проц.

У гэты-ж дзень брыгада т. Горахава выпусціла 3.515 сумак, замест 2.375 па плану. Брыгада т. Ярчака выканала план вырабу партманэ на 141 проц. На 130,2 проц. выканана заданне па вырабу дарожных рэмняў брыгадай т. Ясінскага.

22 КРАСАВІКА — ПАРТЫЙНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ СТАЛІНСКАГА РАЁНА

Партыйная канферэнцыя Сталінскага раёна адкрываецца 22 красавіка ў 6 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва (вялікая зала).

Вылача мандатаў дэлегатам канферэнцыі будзе праводзіцца ў памяшканні РК КП(б)Б (Чырвонаармейская, 16, пакой 24) 20 і 21 красавіка з 9 да 2 гадзін дня і з 6 да 10 гадзін вечара, а 22 красавіка — з 9 да 2 гадзін дня.

Сакратар Сталінскага РК КП(б)Б ЛІТВІН.

НЕАРГАНІЗАВАНЫЯ ВЫБАРЫ

Учора закончыўся сход Менскай сельскай раённай партыйнай арганізацыі. Правезены выбары членаў райкома, кандыдатаў і дэлегатаў на з'езд КП(б)Б.

Тройчы галасаваліся кандыдатуры ў члены райкома. Спачатку было абрана 12 чалавек. Потым праводзіліся давыбары 7 чалавек. Са спісу, які галасаваўся ў другім туры ў 33 чалавекі ні адна кандыдатура не атрымала большасці галасоў. Пасля гэтага прыступілі да новага абмеркавання кандыдатур. У спіс было вынута больш 30 кандыдатур, 15 з іх адвезена адкрытым галасаваннем.

Пашыранае пасяджэнне новаабранага парткома мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава за абмеркаваннем плана работы партарганізацыі на 2-ю палову красавіка і на май месяц. Пасяджэнне праводзіць сакратар парткома тав. Мацюш.

Фото Б. Вернера (БСФ).

УНОЎ АБРАНЫМІ ПАРТОРГАНАМІ ГАРКОМ НЕ КІРУЕ

Правядзенне справаздачна-выбарчых сходаў у Гомельскай партарганізацыі набліжаецца к канцу. На 15 красавіка правезены справаздачна-выбарчыя сходы ў 84 первічных партарганізацыях і пачаты ў 35 арганізацыях.

Велізарная большасць выступаўшых у спрэчках таварышоў адзначае адрыў гаркома партыі ад первічных арганізацый. У первічных партарганізацыях члены бюро і сакратары гаркома—рэдкія госці. Калі яны і прыедуць калі-небудзь, то да радавога комуніста так і не даходзяць, з імі нэ размаўляюць. Аб сувязях з беспартыйнымі масамі і гаварыць не прыходзіцца. Тут Гомельскаму гаркому няма чым пахваліцца. Сакратар гаркома тав. Стакун можа прывесці толькі адзінкавыя факты сваёй прысутнасці на рабочых сходах. Не лепш і з астаткімі членамі бюро гаркома. Вось адзін факт, у якім з гораччу павінен быў прызнацца сам тав. Стакун. Яшчэ летам 1936 года беспартыйная работніца шклозавода, член ЦВК БССР тав. Левачкіна напісала пісьмо тав. Стакуну, у якім яна просіць, каб праставілі ёй магчымасць пагаварыць з ім. Гэтае жаданне так і не ажыццявілася. Стакун яе так і не прыняў.

Комуністы рэзка крытыкуюць кіраўніцтва первічных партарганізацый і асабліва гаркома партыі за слабую пастаноўку партыйнай прапаганды ў гарадской партыйнай арганізацыі. На працягу доўгага часу культпроп гаркома узначальваўся ад'яўленым ворагам народу—трацкістам Фалкіным. Можна сабе ўявіць, як ён кіраваў партыйнай прапагандай. Сакратары парткомаў і гаркома партыі самаўхіліліся ад кіраўніцтва гэтай важнейшай работай. Правядзеная 14 красавіка нарада па гэтаму пытанню ў гаркоме партыі паказала, што яны і зараз гэтай работай не кіруюць. На гэтай нарадзе ні адзін з прысутнічаўшых сакратароў буйных первічных партарганізацый не мог расказаць, як справа абстаіць з пастаноўкай партыйнай прапаганды ў іх арганізацыях. Партыйная прапаганда ў большасці выпадкаў аддана на волкун загатчыку парттабінетам і асобным прапагандыстам. Іменна таму ў партарганізацыі ёсць шматлікія факты фармальных бюракратычных адносін да камплектавання сеці партыйнай асветы.

У дробных партарганізацыях, асабліва ў партарганізацыях сампромкааперацыі, прама гаварылі, што гарком не ведае, што робіцца ў малалікіх арганізацыях. Між тым запушчанасць у пастаноўцы партыйна-масавай работы тут больш за ўсё адчувалася.

Прамой нечаканасцю для гаркома з'явіўся той факт, што ў партарганізацыі гомельскага аддзялення Белхарчгандля, былы дырэктар Бейлін, які не так даўно выкрыт, як заядлы вораг народу, груба зашкодзіў самакрытыку, верхаводзіў у партыйнай арганізацыі. Ён падкупіў сакратара парткома, незаконна выдаў яму з дзяржаўнай кішэні 1.800 руб. для куплі каровы. Толькі на справаздачна-выбарчым сходзе выявіліся гэтыя факты.

У выніку выбораў кіруючыя парторганы значна абноўлены. Так, напрыклад, у 31 первічнай партарганізацыі з выбраных у склад парткома 137 чалавек 82 чал. — новыя, якія не састаялі раней у выбарных органах. З 42 парторгаў первічных партарганізацый 16 чал.—новыя, якія не былі раней на партрабоце. Гэта гаворыць аб тым, што значныя кадры вырасшых, праверваных людзей уключаюцца ў актыўную кіруючую партыйную работу. Гэтыя людзі патрабуюць сур'ёзнай дапамогі і падтрымку, канкрэтнага кіраўніцтва. Нажаль, Гомельскі горком з гэтымі кадрамі зусім яшчэ не працуе.

Наогул трэба сказаць, што ўноў выбраныя парткомы і парторгі яшчэ не ўзяліся за сапраўднае ажыццяўленне ўсіх тых шматлікіх прапаноў, якія высунуты комуністамі на партыйных сходах.

Асобныя сакратары парткомаў (завод імя Кірава) нават не маглі адказаць на пытанне, як яны думаюць размеркаваць работу паміж членамі парткома. Распрацаваных канкрэтных планаў работы на аснове ўліку прапаноў, прынятых на партыйным сходзе, няма яшчэ ў большасці арганізацый. Гарком партыі таксама пакуль што не займаецца гэтай важнейшай справай, не кіруе работай уноў выбраных парторганаў первічных партарганізацый, не ведае, што ў іх робіцца. Гарком не ўлічыў тое, што ўзнаўшаяся актыўнасць на справаздачна-выбарчых сходах павінна з'явіцца толькі пачаткам росту актыўнасці кожнага комуніста і кожнай арганізацыі паасобку.

ОФЕНГЕЙМ.

АБ ПАМЫЛКАХ РАЙКОМА НІЧОГА НЕ СКАЗАНА

На абмежаваўшы час сакратару РК КП(б)Б тав. Дамброўскаму для даклада аб рабоце бюро і пленума Дзержынскага РК КП(б)Б, раённы партыйны сход спадзяваўся, што на гэты раз сакратар райкома ў сваёй справаздачы з усёй вастрынёй большэвіцкай самакрытыкі прызнае свае памылкі, ускрые іх прычыны, прааналізуе абстаноўку, паразвіўшую гэтыя памылкі, і намеціць шляхі іх выпраўлення.

Сход чакаў што пасля самакрытычнай справаздачы ў разгорнутых спрэчках кожны член і кандыдат партыі, следуючы прыкладу сакратара, ускрые ўласныя памылкі і хутчэй знойдзе тое галоўнае звяно ў сваёй рабоце, ухапіўшыся за якое ён змог-бы выцягнуць палы ланцут пытанняў для перабудовы ўсёй работы па-новаму.

Але сход памыліўся. Даклад атрымаўся без самакрытыкі ў поўным сэнсе гэтага слова. Дамброўскі не зрабіў для сябе вывадаў з крытыкі работы райкома, якая адбылася на справаздачных сходах первічных партарганізацый. Ён палічыў ніжэй сваёй годнасці расказаць сходу за што члены і кандыдаты партыі крытыкавалі работу апарата, членаў бюро РК КП(б)Б і асабіста Дамброўскага.

На справаздачных сходах первічных партарганізацый многа гаварылі аб члену бюро т. Крылове, які займаўся сістаматычнай папойкай з былым старшынёй ГВК Вансоўскім, вёў сябе груба ў адносінах да членаў партыі і беспартыйных — старшынь калгасаў. У дакладзе-ж аб паводзінах Крылова Дамброўскі сказаў літаральна некалькі слоў, пры чым слоў, якія па сваёй сіле ўздзейнічання больш падобны на сяброўскі шарж, чым на сапраўдны аналіз грубейшых палітычных памылак Крылова.

Не прараніў ні слова т. Дамброўскі і аб тым, што на ўсіх амаль сходах комуністы гаварылі аб грубых адносінах і нячулым падыходзе яго-ж самога да радавых комуністаў, што часта члены і асабліва кандыдаты партыі проста баяцца заходзіць у габінет да т. Дамброўскага.

Траба спадзявацца, што спрэчкі, якія разгарнуліся па дакладу, дапамогуць райкому і Дамброўскаму зразумець шкодлівасць няўважлівых адносін да голасу радавых членаў партыі, і па-большэвіцку выправіць усе буйнейшыя недахопы, якія так старанна абыйшоў моўчкі сакратар раённага камітэта партыі.

В. РАМАНОЎСКІ.

НА СХОДЗЕ ТУРАЎСКАЙ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

16 красавіка пачаў сваю работу справаздачна-выбарчы партыйны сход Тураўскай райпартарганізацыі. На сходзе прысутнічаюць 90 членаў і 39 кандыдатаў партыі. У справаздачным дакладзе аб рабоце райкома партыі сакратар РК тав. Дамброўскі даў самакрытычны аналіз недахопаў унутрыпартыйнай і палітычна-масавай работы ў раёне, па-большэвіцку прызнаў памылкі райкома, якія прывялі да адрыву ад первічных партарганізацый і прапоўных мас.

Па дакладу тав. Дамброўскага разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі, якія сведчаць аб небывалым росце актыўнасці комуністаў. Усе выступаючыя рэзка крытыкавалі работу райкома, асобных яго членаў, у тым ліку і самаго сакратара. Выступаючыя ўскрывалі прычыны палітычных прарываў у рабоце партарганізацыі, указвалі на наяўнасць у партарганізацыях ідыёцкай хваробы бесклапотнасці, палітычнай дабрадушнасці, сямейственасці, падхалімства і ўгодніцтва, што з'явілася прычынай адсутнасці ў арганізацыі вострай крытыкі і самакрытыкі.

Спрэчкі па справаздачнаму дакладу працягваліся два дні. Выступіла 50 чалавек з ліку 70 запісаўшыхся. Учора сход пачаў абмеркаванне кандыдатур для закрытага тайнага галасавання ў новы склад райкома. У спіс для абмеркавання высунуты на сходзе 32 кандыдатуры.

ФРАЛОЎ.

АБСТРЭЛ МАДРЫДА ПРАДАЎЖАЕЦЦА

МАДРЫД, 18 красавіка. (БЕЛТА). На мадрыдскіх франтах прадаўжаецца запішша, якое вызначаецца ў ваенных зводках словамі «без перамен». Гэта запішша, аднак, менш за ўсё пашыраецца на самы горад. Раздражэнныя поспехамі рэспубліканцаў у часе пяцідзённай аперацыі ў парку Каса дэль Кампо, пазбавіўшыся магчымасці пасылаць падмацаванні і харчаванне ў раён Універсітацкага гарадка і пераконваючыся з кожным днём усё больш, што горад, які пры яркім вясеннім сонцы відаць з пазіцый, як на далоні, зусім непрыступны,—фашысты зрываюць сваю злость на мірным насельніцтве.

Штодзень яны пасылаюць у горад па некалькі дзесяткаў цяжкіх снарадаў. Сёння ранцою снарады падалі на вуліцах Прасіядос, Тэтуан, Кармэн, Орталеса і на Пуэрта дэль Соль. Як заўсёды, спрод афяр—вялікі процант дзяцей.

Адзін снарад папаў у будынак турмы, дзе трымаюцца арыштаваныя фашысты, што належаць да так званай «Пятай калоны». Гэтым снарадам забіт адзін і ранена пяць арыштаваных. Першы снарад папаў у будынак гэтай турмы яшчэ 11 красавіка, як аб гэтым сёння паведамляе вячэрняя газета «Кларыцал». Тады снарадам быў забіт адзін з вінейшых мадрыдскіх фашыстаў і ранена 4 іншых арыштаваных.

Сёння, пасля поўдня, абстрэл горада прадаўжаецца.

ПІСЬМО ГЕНЕРАЛА МІЯХА МАДРЫДСКІМ КОМУНІСТАМ

МАДРЫД, 18 красавіка. (БЕЛТА). У адказ на прывітальную тэлеграму ад мадрыдскай абласной канферэнцыі комуністычнай партыі старшыня камітэта абароны Мадрыда генерал Міяха паслаў пісьмо мадрыдскаму абласному камітэту, выказваючы падзяку за высокую ацэнку яго заслуг у абароне Мадрыда. Пісьмо заканчваецца наступнымі словамі:

«Мне вядома ўсё, што компартыя робіць для рэспублікі, якія афіары панесены ёю, якія буйныя прадстаўнікі яе палі, абараняючы рэспубліку. Мне вядома, колькі комуністаў гатовы аддаць сваё жыццё, каб хутчэй пакончыць са здрадніка мі і з іх арміямі, якія прадаюць нашу радзіму, якія хочуць яе знішчыць».

АДПРАЎКА ІТАЛЬЯНСКІХ ЧАСЦЕЙ Ў ІСПАНІЮ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 17 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе орган компартыі «Юманітэ» з Мілана (горад у Італіі), адзе італьянскія дывізіі знаходзяцца у парту Спецыя, чакаючы загаду адправіцца ў Іспанію.

За апошні месяц на дапамогу генералу Франко было адпраўлена 700 італьянскіх афіцераў, завербаваных у свой час для ваенных дзеянняў у Абісініі.

ЗМОВА РУМЫНСКІХ ФАШЫСТАЎ

ВЕНА (сталіца Аўстрыі), 17 красавіка. (БЕЛТА). Тут атрыманы зусім даставерныя звесткі аб сур'ёзнай актывізацыі дзейнасці фашысцкай арганізацыі «Жалезная гвардыя», якая з'яўляецца, як вядома, гітлераўскай агентурай у Румыніі. Нядаўна румынская паліцыя выявіла ў часе праведзеных вобыскаў, што «Жалезная гвардыя» атрымала з Германіі шмат зброі пад выглядам розных тавараў. У сувязі з тым, што прынц Нікалай па ўнушэнню «Жалезнай гвардыі» імкнуўся абвясціць сябе галоўнакамандуючым румынскай арміяй, ён пасля пазбаўлення яго правоў члена дынастыі, знаходзіцца пад арыштам у сваім палацы Снагоф. 14 красавіка атрад фашыстаў, легіянераў «Жалезнай гвардыі», колькасцю ў 400 чалавек, імкнуўся вызваліць Нікалая з-пад арышту. Атрад быў рассеян двума ротамі жандараў. Кіраўніцтва «Жалезнай гвардыі» выпусціла маніфест, у якім яно рэзка выступае супроць кароля, прэм'ер-міністра Татарэску і пагражае ім расправай.

15 красавіка кіраўнік «Жалезнай гвардыі» Кодрэану склікаў усіх камандзіраў легіёна і вінейшых кіраўнікоў сваёй арганізацыі на нараду. На гэтай нарадзе Кодрэану заявіў: «Выступленне легіянераў (14 красавіка) — не канец, а пачатак барацьбы. Калі прынц Нікалай будзе выгнан з краіны, гэта барацьба ператворыцца ў жорсткую, бязлітасную барацьбу. Мы павінны змагацца, інакш мы загінем».

УЗДЫМ АНТЫФАШЫСЦКАГА РУХУ Ў ГЕРМАНІІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 18 красавіка. (БЕЛТА). Орган компартыі «Юманітэ» паведамляе, што 10 і 11 красавіка адбывалася пад старшынствам пісьменніка Генрыха Мана канферэнцыя камітэта па падрыхтоўцы германскага народнага фронта. У канферэнцыі прымалі ўдзел прадстаўнікі ўсіх антыфашысцкіх груповак у Германіі—прадстаўнікі соцыял-дэмакратаў, комуністаў, распушчаных фашыстамі хрысціянскіх профсаюзаў і дэмакратычных буржуазных партый. Ва ўступнай прамове Генрых Ман указаў на ўзнікненне апазіцыйнага руху ў «Трэцяй імперыі». Вілі Мюнцэнберг, аналізуючы розныя групоўкі гэтага руху, указаў, што ідэя народнага фронта ўсё больш пашыраецца ў Германіі, а поспехі народнага фронта ў Францыі і ў Іспаніі зарадзілі новыя надзеі на хуткае падзенне фашызма.

Усю дзейнасць асобных антыфашысцкіх груп у Германіі неабходна аб'яднаць у адзіны магутны антыфашысцкі рух у імя развіцця народнай рэволюцыі. Тая роля, якую ў надыходзяй баях адыграе германскі рабочы клас, — сказаў у заключэнне Мюнцэнберг,—перашкодзіць таму, каб новая германская дэмакратыя была падобна на веймарскую. (Веймарская канстытуцыя была асноўным законам германскай рэспублікі да захвату ўлады фашыстамі). Гэта будзе дэмакратыя, якая за канца знішчыць фашызм. Канферэнцыя атрымала прывітальныя тэлеграмы ад выдатнага пісьменніка Томаса Мана і ад батальёнаў германскіх добраахвотнікаў, якія змагаюцца ў радах іспанскай рэспубліканскай арміі.

Канферэнцыю наведалі члены прыхаўшай у Парыж дэлегацыі іспанскіх дэпутатаў на чале са старшынёю картэсаў (парламента) Барыёс.

Адвагалосна прынят зварот з заклікам да ўсіх, каму дорага свабода, аб'яднаць свае сілы для перамогі над фашызмам.

* * *

БЕРЛІН (сталіца Германіі), 18 красавіка. (БЕЛТА). Фашысты ўжо адкрыта гаворыць аб палымаючым галаву «ўнутраным ворагу». Так, выступаючы ўчора на абласным з'езде фашысцкай партыі ў Карлсруэ Розенберг абураўся тым, што ў Германіі «за гэтага часу існуюць групы, якія не жадаюць праясняцца духам часу».

Паліцэйскі генерал Далюге абрушыўся «на колы, якія хаваюць свае сімпатыі да большэвізма», і пагражаў прымяненнем самых жорсткіх рэпрэсій супроць антыфашысцкага руху.

НАЦІСК ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА НА ПАЎДНЁВЫ ЎСХОД

І. АЛЕКСАНДРАЎ

На працэсе антысавецкага трацкісцкага цэнтра былі асветлены злачынныя метады, з дапамогай якіх германскі фашызм разлічвае палегчыць сабе захват дунайскіх і балканскіх краін. Трацкісцкія выраслкі, як вядома, абавязваліся садзейнічаць ажыццяўленню фашысцкіх захватніцкіх планаў і ў гэтай частцы Еўропы.

Інтрыгі германскага фашызма ў паўднёва-ўсходняй Еўропе выклікаюць растучую трывогу ва ўсім свеце. Наглыя нападкі германскага фашызма на Чэхаславакію, бясчынствы гітлераўцаў у Румыніі, падрыхтоўка гітлераўскага мяжу ў Венгрыі, эканамічнае закабаленне Балгарыі «Трэцяй імперыяй» — усе гэтыя факты апошняга часу сведчаць аб растучай пагрозе міру на Дунаі і на Балканах. Бідныя заходнееўрапейскія дзеячы адкрыта выказваюць меркаванні, што буйная вайна можа пачацца, як і папярэдняя, на паўднёвым усходзе Еўропы.

Германскае пранікненне ў паўднёва-ўсходнюю Еўропу набыло асабліва шырокія памеры з часу абісінскай авантуры італьянскага фашызма. Раней фашысцкая Італія аспрачвала ў гэтай частцы Еўропы ўплыў у Францыі. Але, увязаўшыся ў вайну ва ўсходняй Афрыцы, Італія страціла некаторыя свае ранейшыя пазіцыі па Дунаі і на Балканах, а «Трэцяя імперыя» паспяшыла гэта скарыстаць.

Гітлераўскія планы пакарэння паўднёва-ўсходняй Еўропы апіраюцца на шырокае гаспадарчае наступленне. Апошнія праводзіцца па праграме, выпрацаванай главой рэйхсбанка (дзяржаўны банк Германіі) Шахтам. Па інструкцыі Шахта германскія гандлёвыя фірмы ўзмацнілі закупкі ў дунайскіх і балканскіх краінах. Гэта адпавядала гандлёвым інтарэсам Германіі, якая мае патрэбу ў сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіне гэтых краін. Германскія купцы набывалі там прадукты харчавання і сыравіну па нізкіх цэнах, карыстаючыся спрыяючымі ўмовамі, створанымі сельскагаспадарчым крызісам.

Затым, зноў-такі па інструкцыях Шахта, германскія фірмы пачалі цераспрадаваць за граніцу закупленую ў паўднёва-ўсходняй Еўропе сыравіну. Карыстаючыся сваімі шырокімі сувязямі, спекулянты «Трэцяй імперыі» сталі паступова выцясняць з сусветных рынкаў дунайскіх і балканскіх гандляроў. Такім шляхам яны сталі прыбіраць да рук замежны гандаль гэтых краін.

Падобныя аперацыі дазваляюць «Трэцяй імперыі» атрымліваць велізарны прыбытак. Справа ў тым, што Шахт расплочваецца з дунайскімі і балканскімі пастаўшчыкамі так званымі «замарожанымі маркамі», гэта значыць грошовымі знакамі, не падлягаючымі пераводу за граніцу. Такім шляхам Германія робіць даўжніпай сваіх пастаўшчыкоў. У сучасны момант сума германскага доўгу краінам еўрапейскага паўднёвага ўсходу пасягнула велізарных памераў. Па вестках англійскага публіцыста Эльвіца Джонса, запазычанасць Германіі Грэцыі дасягае 30 мільёнаў марак, Венгрыі — 25 мільёнаў Югаславіі—21 мільёна, Румыніі — 18 мільёнаў, Балгарыі — 10 мільёнаў марак. Для гэтых невялікіх краін падобныя «замарожаныя крэдыты» з'яўляюцца непасільным цяжарам.

Тут зноў з'яўляюцца на сцэне агенты Шахта, прапануючы ўзамен «замарожаных крэдытаў» германскія прамысловыя вырабы. З тае прычыны, што гэтыя краіны не маюць магчымасці купляць вялікую колькасць прамысловых тавараў, ім прапануюць «просты» выхад: набываць ваеннае снаражэнне. І сапраўды, у апошні час дунайскія і балканскія краіны набываюць у Германіі на «замарожаныя маркі» буйныя партыі зброі. У прыватнасці самалёты, танкі, артылерыйскія гарматы, снарады і т. д.

Падобныя закупкі не толькі садзейнічаюць развіццю германскай ваеннай прамысловасці, але і павялічваюць палітычную залежнасць дунайскіх і балканскіх краін ад «Трэцяй імперыі». Іх арміі маюць патрэбу ў германскіх інструктарах для асваення набываемай ваеннай тэхнікі. У выпадку-ж ваенных дзеянняў яны будуць мець вострую патрэбу ў германскіх авіяцыйных, артылерыйскіх і іншых запасных частках, а таксама ў снарадах. Берлінскія правіцелі не без падставы мяркуюць, што гэта акалічнасць знойдзе адлюстраванне ў палітыцы адпаведных дзяржаў.

Па апошніх вестках, аб'ём гандлёвых зносін паміж Германіяй і краінамі паўднёва-ўсходняй Еўропы набыў выключна буйныя памеры. Германскі ўвоз у Балгарыю дасягнуў у 1936 годзе 62,5 проц. усяго балгарскага ўвозу, германскі вываз з Балгарыі — 47,9 проц. усяго балгарскага вываз. У замежным гандлі Грэцыі германскі ўвоз складае 22 проц., вываз — 44 проц.; у замежным гандлі Югаславіі адпаведна — 26,3 і 22,2 проц.; у замежным гандлі Румыніі — 62 і 27,4 проц.; у замежным гандлі Венгрыі — звыш 23 і звыш 24 проц. Вельмі вырасла і германская доля ў замежным гандлі Турцыі. Лічбы германскага гандлю з дунайскімі і балканскімі краінамі раступь з месяца ў месяц; аналагічна расце і іх залежнасць ад «Трэцяй імперыі».

Падвозячы вынікі эканамічнай актыўнасці Германіі ў паўднёва-ўсходняй Еўропе, турэцкая газета «Тан» пісала: «Германія, якая дабіваецца калоній, лавіла Турцыю і балканскія краіны да такога становішча, што ажыццяўляюцца ўсе тыя манапольныя ўмовы, якіх індустрыяльная дзяржава звычайна дабіваецца ад калоній». Гэтыя словы наўрад ці перапавялічаны.

Па меры ўзмацнення свайго гаспадарчага ўплыву ў дунайскіх і балканскіх краінах, гітлераўская Германія ізвінічае там усё больш бесцэрамонна і нагла. Велізарны зарубежны апарат германскага фашызма пастаўлен на службу задачы закабалення гэтых краін.

Агенты германскага фашызма шукаюць сабе апору ў першую чаргу сярод нямецкага насельніцтва паўднёва-ўсходняй Еўропы. У некаторых яе раёнах ёсць даволі значная праслойка нямецкага насельніцтва. Яно падвяргаецца ўзмоцненай апрацоўцы наёмнікаў германскага міністра прапаганды Гебельса. Усюды пасланцамі Гебельса пасаджаюцца тайныя або яўныя, у залежнасці ад мясцовых умоў, гітлераўскія арганізацыі. Удзельнікі іх абучаюцца валодаць зброяй і закліканы адыгрываць у выпадку ваеннай сутычкі ролю рэзервуў германскай арміі ў тыле ў магчымага праціўніка.

У якасці прыкладу гітлераўскай падрыўной арганізацыі можна прывесці так званую партыю «судэцкіх немцаў» у Чэхаславакіі, што ўзначальваецца Генлейнам. Гэта партыя адкрыта выступае за адрыў значных тэрыторый ад Чэхаславацкай рэспублікі. Яе глава Генлейн вандруе па Еўропе, агітуючы ў Лондане і ў іншых месцах за раздзел Чэхаславакіі. Генлейн недвусэнсоўна высоўвае сваю кандыдатуру на ролю чэхаславацкага Франко.

Германская фашысцкая арганізацыя — Гестапо навядвае паўднёвы ўсход Еўропы сваімі агентамі: яны прыязджаюць тулы пад выглядам гандляроў, журналістаў, кінааператараў, турыстаў. Пад якой-бы лічынай ні завітвалі, яны пазначна займаюцца падрыўной работай: шпіянажам, арганізацыяй дыверсійных і тэрарыстычных актаў, подкупамі буржуазных партый, газет і асобных дзеячоў.

Тэрарыстычныя акты Гестапо сталі амаль штодзённай з'явай на паўднёвым усходзе Еўропы. Гестапо арганізавала ў свой час забойства аўстрыйскага канцлера Дольфуса і румынскага прэм'ера Дуца. Спіс злачынстваў Гестапо ў дунайскіх і балканскіх краінах далёка не абмяжоўваецца гэтымі пашумеўшымі забойствамі.

16 ліпеня 1936 г. банды гітлераўскай «Жалезнай гвардыі» ўварваліся ў буйнейшую больніцу Бухарэста—сталіцы Румыніі. Там ляжаў віны румынскі дзеяч Сталеску, які перанёс аперацыю апендыцыта. Гітлераўскія забойцы застрэлілі яго на бальнічным ложку ў помсту за тое, што ён быў праціўнікам фашысцкай «Жалезнай гвардыі». У канцы жніўня мінулага года ў ваколіцах Кішэнёва было знойдзена цела віднага члена напыналцараніцкай (сялянскай) партыі Сімоца, забітага «жалезнагвардзейцамі».

У верасні 1936 года аказаўся пры смерці былы міністр замежных спраў Румыніі, паслядоўны прыхільнік калектыўнай абароны міру Тытулеску. Ён падвергся атручанню ў часе прабывання на курорце у Сен-Марысе (Швейцарыя). Англійскі і французскі друк пасля паведамілі даныя расследвання па справе аб атручанні Тытулеску. Згодна гэтых даных, адзін з агентаў Гестапо пастуціў у якасці повара ў гасцініцу, дзе жыў Тытулеску, і штодзень падмешваў у яго ежу невялікую порцыю атруты, каб яго смерць паказалася натуральнай.

Галоўныя намаганні гітлераўскіх дыпламатаў у паўднёва-ўсходняй Еўропе накіраваны зараз на тое, каб узарваць Малую Антанту — саюз Чэхаславакіі, Румыніі і Югаславіі. Гэты саюз умацоўвае абароназдольнасць кожнай з удзельнічаючых у ім краін і звязвае іх з Французскай рэспублікай. Натуральна, што гітлераўскія дыпламаты ўсіляк прабуюць аслабіць і разбіць Малую Антанту, адарваўшы ад яе Югаславію і Румынію. У апошні час Югаславія заключыла дагаворы з Італіяй і Балгарыяй, што панесла шкоду згуртаванасці Малой Антанты.

Фашысцкая Германія нетвусэнсоўна пагражае зараз ваенным напалам на Чэхаславакію — найбольш трывалае звяно Малой Антанты. Чэхаславакія з'яўляецца паслядоўнай прыхільніцай калектыўнай абароны бяспекі; яна падтрымлівае саюзныя адносіны з Францыяй і заключыла дагавор аб узаемнай дапамозе супроць нападаючай краіны з Совецкім Саюзам. Гэтага германскія фашысты ніяк не хочуць дараваць Чэхаславакіі. У апошні час германскія фашысцкія газеты асабліва груба нападаюць на Чэхаславакію; яны вінавацяць яе ў тым, што яна выццам стала «большэвіцкай».

Некаторыя англійскія і французскія газеты выкрылі германскія планы нападу на Чэхаславакію. Паводле гэтых выкрыццяў, германскі фашызм збіраецца ў цеплёкім будучым арганізаваць мяжу на тэрыторыі Чэхаславакіі пры дапамозе партыі «судэцкіх немцаў». Пры першай-жа ўспышцы мяжу германскія войскі пяройдуць чэхаславацкую граніцу, а бамбардыроўшчыкі з'явяцца над Прагай.

Несумненна, што германскія планы супроць Чэхаславакіі тояць найвялікшую пагрозу не толькі для бяспасных гэтай краіны, але і для ўсеагульнага міру. Напад на Чэхаславакію з'явіўся-б толькі першым крокам к ваенным дзеяннням «Трэцяй імперыі» па пакарэнню ўсёй паўднёва-ўсходняй Еўропы. Такія ваенныя дзеянні, несумненна, уцягнулі-б у ваенны вадаварот усю Еўропу.

Прыхільнікі згавору з фашысцкай Германіяй у дунайскіх і балканскіх краінах запэўніваюць, што цаной адмаўлення ад самастойнай палітыкі і падпарадкавання германскаму фашызму можна купіць прыхільнасць Гітлера. Аднак, падзеі ў Венгрыі паказваюць, якую цану мае прыхільнасць важака германскага фашызма. Венгрыя заўсёды падтрымлівала цесныя, прыязныя адносіны з фашысткімі дзяржавамі — з Італіяй і Германіяй. Венгерскія дзяржаўныя дзеячы часта езадзілі на паклон да Гітлера, а пасланцы Гітлера, у сваю чаргу, увесь час наведвалі Венгрыю. Венгерская армія цесна звязана з германскай. Але лістаўныя адносіны Венгрыі да германскіх фашыстаў толькі навялі іх на мысль аб тым, каб канчаткова прыбраць гэту краіну да рук і выгрупіць аптуль уплыў сваёй «даражайшай саюзніцы»—Італіі. І вось нязадоўга венгерская грамадзкасць была патрасена ўрадавым паведамленнем аб раскрыцці гітлераўскай змовы. Гітлераўскія агенты рыхтавалі напад на венгерскую сталіцу—Будапешт. У разе венгерскіх гаразоў яны ўжо паспелі правесці вулічныя выступленні. У змове прымалі ўдзел некаторыя венгерскія дзеячы, афіцэры і нават чыноўнікі паліцыі. Ніці змовы схаваліся ў германскім пасольстве ў Будапешце.

Падзеі ў Венгрыі з'явіліся ўрокам таго, што пошукі гітлераўскай прыхільнасці ад сім не могуць прынесці малым дзяржавам паўднёва-ўсходняй Еўропы спакой і мір. Наадварот — такая палітыка толькі распальвае непасытныя апетыты германскага фашызма. Толькі цвёрды адпор інтрыгам гітлераўскіх агентаў і калектыўная абарона бяспасных могуць забяспечыць мір у паўднёва-ўсходняй Еўропе, што знаходзіцца зараз пад вялікай пагрозай.

12 ТЫСЯЧ МАТОРАЎ

У Магілеве пры заводзе імя Дзімітрава будуецца першы ў Совецкай Беларусі электраматорны цэх. Будаўніцтва цэха мае велізарнае значэнне. Ён будзе выпускаць штогодна 12 тысяч матораў тыпу И-2. Зараз на прадпрыемствах большасць варштатаў працуе ах агульных трансмісій. У разультаце гэтага — вялікі перавыдатак электраэнергіі, атрымліваецца дрэнны косінус фі. Выпуск матораў И-2 дасць магчымасць перавесці варштаты на індывідуальныя прыводы, чым прынясе велізарную эканомію.

Асноўныя работы па будаўніцтву цэха закончаны. Зараз вялуцца атынкоўка, пабелка і санітарна-тэхнічныя работы. У эксплаатацыю цэх павінен быць адан к 1 ліпеню.

Прыбывае і ўстанаўліваецца рад варштатаў.

З асноўнага абсталявання нехапае яшчэ двух гідраўлічных прэсаў, на выраб якіх нават яшчэ не атрыманы нарады. Няма варштата для ўнутранай шліфоўкі корпуса матора, няма трохфазнага гатэнцыяльнага рэгулятара для вымярання напружання матора. Наркаммясцпром слаба дапамагае заводу ў хутчэйшым абсталяванні цэха варштатамі. Заслугоўваюць увагі адносіны некаторых прадпрыемстваў Беларусі да вырабу абсталявання для электраматорнага цэха.

Віцебскі завод «Чырвоны металіст» імя Кірава, напрыклад, павінен зрабіць два камплекты штампаў для вырубкі кальца вентылятара. Але выкананне заказа ідзе вельмі марудна. Дрэнна адносіцца да выканання заказа і віцебская акулярная фабрыка, якая абавязана зрабіць штампы для вырабу самых адказных частак матора.

Для навучання тэхналагічным працэсам вырабу матораў паслана на ленінградскі завод «Электрасіла» 20 рабочых, які, пасля трохмесячнага навучання будуць працаваць у цэху брыгадзірамі па ўчастках. Два майстры пасланы туды для вывучэння выпрабавальных работ матораў, абмоткі і зборкі іх. Пасля звароту ўсіх гэтых таварышоў будуць створаны курсы тэхмінімума для астатніх рабочых.

Р. Д.

АХОВАЙ ПРАЦЫ НІХТО НЕ ЗАЙМАЕЦЦА

На гомельскім інструментальным заводзе пытаннем аховы працы ніхто не цікавіцца. Адсюль зусім не выпадкова, што з 9 цэхаў, якія ёсць на заводзе, ні ў адным няма вентыляцыі. Рабочыя неаднаразова выказвалі сваё абурэнне па гэтаму пытанню дырэктару завода Ліпкіну, парторгу Ляскову і старшыні заўкома Гельбергу. Да голасу рабочых яны прывыклі прыслухоўваецца на нашым заводзе. Прамым шкодніцтвам і адсекваннем над рабочымі можна кваліфікаваць такія паводзіны, бо ў цэхах нельга дыхнуць ад згушчонага паветра.

Затое, калі што датычыць сваіх асабістых інтарэсаў, то тут заўзятыя адміністратары дзяржаўныя грошы не адрозніваюць ад сваіх. Яны за кошт завода зрабілі для сябе поўнае хатняе абсталяванне.

Заводская газета (рэдактар т. Савінская), якая заклікана ўсямерна разгортваць крытыку для знішчэння недахопаў на заводзе, не з'яўляецца пакуль што прыкладам у гэтых адносінах. Матарыялы рабкораў, якія пішуць у газету, «апрацоўваюцца» так, што самыя вострыя пытанні ў заметцы змазваюцца і ўвесь сэнс яе губляецца.

ФІЛІПОВІЧ.

Бяздушна аднесліся да рабочага

Дзевяць месяцаў я працаваў на гомельскім дрэваапрацоўчым камбінаце імя Гікало. Лічыўся стаханаўцам, выконваў план на 200—300 проц. Але 1 кастрычніка мінулага года мяне зволілі за прагул. Факт бясспрэчны, прагул я зрабіў. Справа ў тым, што я жыву за сем кілометраў ад камбіната і ў гэты дзень не ішлі аўтобусы. Зрабіў я, безумоўна, дрэнна, у гэтым я прызнаў сваю віну. Але ні адміністрацыя, ні фабком не палічыліся з гэтымі акалічнасцямі. Мяне зволілі, не выдаўшы ніякіх даведак і не зняўшы з учоту. У выніку вось ужо сёмы месяц, як я не магу нідзе паступіць на працу. Мне здаецца, што да мяне аднесліся бяздушна.

З. СОМІН.

Каштоўны апарат псуецца

Калгас «Чырвоны баец», Дабрынеўскага сельсовета, Дзержынскага раёна, да XIX галавіцы Кастрычніцкай рэволюцыі атрымаў падарунак ад Саўнаркома БССР — кіноапарат.

У выніку бестурботнасці старшыні калгаса Карачуна з вялікімі цяжкасцямі гэты апарат устанавілі толькі праз 4 месяцы. Зараз кіноапарат зноў не выкарыстоўваецца.

Карціны не дэманструюцца, яны прыбываюць у калгас, згодна заключанага дагавору, і адпраўляюцца назад. Карачун вядзе яўна шкодныя разважанні аб тым, што кіно для калгаса ўбытачна і кінокарціны нічога не даюць калгаснікам. Гэтая варожая агітацыя не атрымала да гэтага часу належнага адпору з боку сельсовета, а таксама і ад раённых арганізацый.

Каштоўны апарат іржавее і псуецца, нават будка, дзе знаходзіцца апарат, не замыкаецца.

КАСПЕРОВІЧ І КАЛЕЧЫЦ.

Аб партрэтах вялікіх вучоных і пісьменнікаў

Нашы дзеці вывучаюць фізіку, хімію, прыродазнаўства, гісторыю, геаграфію. Чытаючы падручнікі па гэтых дысцыплінах, яны сустракаюць рад імён вучоных. Але вучні іх не ведаюць, бо ў кніжках нават няма малюнкаў, а калі і ёсць, дык маленькія і не яскравыя. Так здараецца нават і з класікамі-пісьменнікамі.

Я звяртаюся праз газету «Звязда» з прапановай, каб наша выдавецтва і Наркомасветы зрабілі ў самы хуткі час выпуск партрэтаў вялікіх вучоных і пісьменнікаў — класікаў. Гэтага патрабуюць нашы школы, нашы дзеці.

БЕРДНІКАЎ,
(Добрушскі раён).

Не наведваюць заняткі

Ісуе-на шкозаводзе «Окцябр» (Асіпавіцкі раён) школа па ліквідацыі малапісьменнасці і раштак непісьменнасці. Але за апошнія 2—3 месяцы заняткі ў ёй сістэматычна зрываюцца. Яе наведвае ўсяго 8—10 проц. тых, хто павінен абавязкова вучыцца. Асабліва дрэннае наведванне з III змены (дзесятнік Баршай) і з змены шліфоўкі (дзесятнік т. Казлоўская Э.).

Заўком і партком не займаюцца справай вучобы малапісьменных рабочых, растлумачальнай работы не праводзяць.

С. ХІЛЬКЕВІЧ.

Канал Волга—Масква. НА ЗДЫМКУ: шлюз № 8. Фото Ф. Кіслова (СФ).

ТОРФАСЕЗОН СУСТРЭЛІ НЕПАДРЫХТАВАНЫМІ

Торфазавод імя Ген (Смалявіцкі раён) павінен у гэтым годзе здабыць торфу на 40 тысяч тон больш, чым у мінулым. Заданне надзвычай адказнае і выкананне яго патрабуе максімальнага выкарыстання кожнага дня торфасезона.

Больш 10 дзён стаіць сухое і яснае надвор'е. Балота прасохла. Ужо можна было здабыць тысячы тон торфу, але на заводзе да торфаздабычы яшчэ не прыступілі. Больш таго, гэтаму нават знаходзяць «апраўданне». Тэхнічны дырэктар Шухман, напрыклад, вытлумаў «тэорыю» па якой быццам-бы торф, выпрацаваны ў красавіку, будзе нядобраякасны і малакаларыйны. Што хаваецца за гэтай шкоднай тэорыяй здагадацца не цяжка. Непадрыхтаванасць завода да сезона прымушае яго кіраўнікоў выдумваць розныя «тэорыі», у якія яны самі не вераць.

Тэхнічны дырэктар Шухман не цікавіцца і не клапоціцца аб хутчэйшым пуску кар'ера. Ён сам не ведае, што робіцца на заводзе. На палях сцілкі асталося больш, чым 25 тысяч тон таварнага і каля 6 тысяч тон фармовачнага торфу мінулага года, які патрабуе сушкі. Яго трэба як мага хутчэй вывезці з поля сцілкі, але гэта не робіцца. Тры матавозы, якія возяць торф, больш стаяць, чым працуюць і таму складаецца сур'ёзная пагроза выканання плана здабычы.

Яшчэ зараз не закончыўся рамонт машынафармовачных агрэгатаў. На машынах адсутнічае графітная набіўка для прэсаў і ніхто не ведае, дзе яе дастаць. Сёлета павінна працаваць 4 машыны, але ні на адной няма рамнёў. Галоўны механік Матронаў не кіруе рамонтам. Ён часта прыходзіць на завод аглядаць машыны ў п'яным выглядзе. Даволі адзначыць той факт, што пры рамонце лакамабіля механік Хадзюня прывінціў інжэктар не так, як трэба, а Матронаў прыняў машыну і нават не заўважыў гэта. Або яшчэ факт, які паказвае работу Матронава. Пры апробванні машыны пасля рамонту пары вырвалі люк і трубы ў катле патрэскаліся і пачалі прапускаць ваду.

Не падрыхтаваны да сезона і інтэрнаты. Загадчык гаспадарчай часткі Буцько не паклапаціўся дастаць саломы, або стружак для набіўкі матрацаў. Людзі, прымушаны набіваць матрацы гнілой саломай з будак. У пакоях адсутнічаюць шклянкі, чайнікі, рабочыя носяць ваду ў бутэльках.

Стаханаўскі рух пупчан на самацёк. На заводзе працуе больш 500 сталых рабочых, але ніхто не ведае, як яны працуюць. Ні дырэктар завода Скарукін, ні старшыня тарфкома Валенцік, ні парторг Цофер не ведаюць тых рабочых, якія перавыконваюць свае нормы. Стаханаўцам не дапамагаюць, а на заводзе ёсць такія людзі, у якіх ёсць чаму навучыцца, ад якіх можна пераняць вопыт. Вось комсамолка Аферэўская Валя — лепшая стаханаўка завода. Яна прышла на завод тэхнічна няграматнай і за некалькі год асвоіла вытворчасць і стала брыгадзірам. А сёлетняй зімой упарта вывучала трактарную справу і зараз ужо самастойна кіруе трактарам.

Валенцік і Цофер не ўзначалілі культурна-масавую работу. У інтэрнатах вечарамі цёмна і сумна. Вось заходзім вечарам у пакой. На стале стаіць невялікая лямпа, вакол групка дзяўчат. Вітаемся. Дзяўчаты адварочваюцца ад агню і на стале мы бачым некалькі запалак. Замест шашак, даміно дзяўчаты гулялі ў запалкі. У інтэрнатах не праводзіцца чытка газет і адсутнічае ўсякая масавая работа.

Ніхто не праводзіць інструктажа новых рабочых. У выніку рабочы не ведае, дзе ён будзе працаваць і колькі атрымоўваць за працу. Ды і не дзіва, бо торфазавод зараз знаходзіцца без дырэктара. Белторф (дырэктар Кузняцоў) практыкуе перастаноўку дырэктароў у самы разгар сезона. Дырэктар Скарукін пераводзіцца на другі завод, загад аб яго пераводзе падпісан ужо даўно, але марынуецца ў сталах Белторфа. Гэта, безумоўна, адбіваецца на рабоце завода. Такое становішча на заводзе зусім нікога не трывожыць.

П. ЛЕЎ.

КАРЫСНЫ ПАЧЫН

Дзень 6 красавіка з'явіўся для калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі «Іскра», Бешанковіцкага раёна, незвычайным у іх жыцці. Упершыню за доўгі перыяд часу да іх прыехаў прадстаўнік з раённага цэнтра і пагаварыў з імі, што называецца, па душах.

Нельга, праўда, сказаць, каб сюды і раней ніхто не заязджаў. Бывае тут і упоўкамзаг т. Крэпчановіч, загадчык райфа т. Цілятко́ў, старшыня Стрэлішчанскага сельсовета т. Базілевіч, яго намеснік т. Калкоў і інш. Апошнія два з'яўляліся больш частымі гасцямі, але ніхто з іх ніколі і не ўздумаў пацікавіцца жыццём і бытам калгаснікаў, іх запытаннямі, патрабаваннямі і т. д. У лепшым выпадку «прыезджы прадстаўнік» абмяжуецца гутаркай з адным толькі старшынёю калгаса.

На гэты раз прадстаўніком з раёна аказаўся старшыня райвыканкома т. Палюшыс. Яму прышлося спецыяльна адрэкамендавацца, бо абсалютная большасць калгаснікаў яго ўбачылі ўпершыню. Але тое, што пачуў з іх вуснаў т. Палюшыс, было для яго зусім нечаканым.

Калгаснікі, з уласнівай ім чэснасцю і прамотай, пачалі выкладваць усё тое, што ў іх ужо даўно набалела. Усе размовы галоўным чынам круціліся вакол свайго старшыні калгаса Сінкевіча Сцяпана, які груба парушае сталінскі статут сельскагаспадарчай арцелі.

Калгаснікаў штрафавалі масавым парадкам натурай (бульбай і жытам) і прадпаднямі. З 86 прапазіцыльных калгаснікаў за 1936 год аштрафавана 38 чалавек. У 16 калгаснікаў у парадку штрафа ўтрымалі з іх прадпадзён 976 кілограмаў бульбы. 22 калгаснікі аштрафаваны 176 прадпаднямі. Рад калгаснік — Стуканава Арына, Воранава Марыя, Казлова Марына аштрафаваны па 15 прадпадзён кожнай. Такія калгаснікі, як Абухоў Нікіта, Пляпцоў Фёдар, Пляпцова Анна, Сінкевіч Марына аштрафаваны па 3, 5 і 10 прадпадзён асабіста Сінкевічам.

Агідны факт прыводзіць калгаснік Чалаў Аляксей.

— У калгасе, — гаворыць ён, — усім было вядома, што ў мяне цяжка хварэла малое дзіця, з-за чаго жонка мая Вольга некалькі дзён не выходзіла на работу. І вось старшыня калгаса Сінкевіч патрабаваў без рашэння праўлення аштрафаваць яе 6 пудамі бульбы.

Беззаконныя дзеянні старшыні калгаса Сінкевіча адным толькі штрафаваннем калгаснікаў не абмяжоўваюцца. Чалава Нікона Сінкевіч зняў з пасады вартаўніка за тое, што яе знайшоў яго на месцы работы. Чалаў у гэты час быў на раённым з'ездзе Советаў. 2 месяцы Сінкевіч не аднаўляў яго на рабоце і аднавіў толькі пасля настойлівага патрабавання калгаснікаў.

Другі факт. У разультаце няправільнага інфармавання Сінкевічам агульнага схода калгаснікаў, быў выключан з калгаса калгаснік Зубакін Фама. Згодна інфармацыі Сінкевіча, т. Зубакін зрабіў 5-месячны злосны прагул, а фактычна ён 4 месяцы знаходзіўся на пераменным аборы і пасля гэтага месяц хварэў. Зубакін на прапяту 3 месяцаў лічыўся выключаным з калгаса.

На ўсе гэтыя беззаконныя дзеянні Сінкевіча калгаснікі скаргаліся ў сельсавет, райком партыі, рэдакцыю раённай газеты «Сталінец», але да іх голасу ніхто не прыслухоўваўся.

Пры сельсавеце ёсць партыйная група, аднак масава-палітычная работа тут абсалютна не праводзіцца. Важнейшыя рашэнні партыі і ўрада (рашэнні Пленума ЦК ВКП(б), даклад таварыша Сталіна, пастанова ўрада аб аслабленні сельсоветаў ад спагнання падаткаў (т. д. і т. п.) да калгаснікаў не даводзяцца.

Сталінская Канстытуцыя тут не вывучаецца. Аб міжнародных падзеях (падзеі ў Іспаніі і інш.) калгаснікаў таксама ніхто не інфармуе. Думаецца, што калгас «Іскра» ў Бешанковіцкім раёне не з'яўляецца выключэннем. І ў гэтым раённае кіраўніцтва неаткладна ўпэўніцца, калі пашырыць вопыт т. Палюшыса.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

ЗЛАЧЫННЫЯ СПРАВЫ У ЛЯДНЯНСКІМ ДЗІЦЯЧЫМ ДОМЕ

(Пісьмо комсамольца)

Пад восень 1936 года ў м. Ляды Дубровенскага раёна быў адкрыт дзіцячы дом. Дырэктарам яго Наркомасветы БССР прыслаў нейкага Гуціна.

Пры першых кроках сваёй работы Гуцін паказаў, што ён не можа працаваць на такой адказнай пасадзе. Яшчэ 8 снежня мінулага года, калі адзін васьмігадовы выхаванец адмовіўся ісці ў дзіцячы сад, Гуцін схапіў яго за вуха, збіў да непрытомнасці і выкінуў за дзверы, не глядзячы на тое, што было халоднае надвор'е. На выхаванцаў Гуцін крычыць, тупае нагамі.

Прашу «Звязду» ўмяшацца ў справы лядняннскага дзіцячага дома і пакласці канец здзекам над дзецьмі.

Л. РАМАНОВІЧ.

***

ДУБРОЎНА. (Ад спец. кар. «Звязды»). Факты, указаныя ў пісьме тав. Л. Рамановіча, поўнасцю пацвярджаліся. Высвятляецца, што з пачатка дня адкрыцця дзіцячага дома Гуцін развальвае работу апошняга, калечыць дзяцей. Варта пагаварыць з выхаванцамі, каб упэўніцца ў варожых дзеяннях Гуціна.

Выхаванец Юзік Эпштэйн, па словах гэтага «дырэктара», недысцыплінаваны, непаслухмяны. Натуральна, выхавацелі павінны былі ўзяць яго пад свой нагляд. Але-ж што робіць Гуцін? Ён грубіяніць, бярэ яго за вуха, збівае да непрытомнасці і выкідае на двор.

— Наш дырэктар, — скардзіцца хлопчык Вася Сімановіч, — нізавошта часта мяне б'е па шчаце. 8 лютага ён моцна пабіў мяне за тое, што кудысьці закінуў у доме свае кніжкі.

Аналагічныя скаргі можна пачуць і ад іншых выхаванцаў. 4 студзеня Гуцін нанёс аплявухі выхаванцу Ваню Некрасаву. 8 студзеня ён пабіў выхаванца Лёву Эпштэйна за тое, што той самавольна зайшоў у канцылярыю дома і папрасіў канверт. 2 лютага «дырэктар» дома збіў хлопчыка Гаву Эпштэйна таксама за тое, што той самавольна зайшоў у канцылярыю.

Калі выхаванец чым-небудзь правініцца, Гуцін «арыштоўвае» яго: здымае верхнюю вопратку, чаравікі, кладзе ў ложак і зачыняе пакой на ключ. Так было з Васяй Сімановічам, Паўлушам Клюевым, Ванем Некрасавым.

Злачынныя паводзіны Гуціна становяцца больш зразумелымі, калі мы з ім пазнаёмімся бліжэй. Хто такі Гуцін? У 1936 годзе ён выключан з радоў партыі, як неразброёўшыйся буржуазіі. У 1933 годзе ён працаваў дырэктарам бабруйскага дзіцячага дома. Да дзяцей адносіўся груба, абкрадаў іх. Пазней працаваў у Мсціслаўскім раёне, дзе таксама працягваў свае злачынныя справы. І вось гэтага «выхавацеля» Наркомасветы БССР перакінуў з Мсціслаўля ў Дуброўну. Тут Гуцін, дзе толькі магчыма, усхваляе Іудушку-Троцкага і іншых ворагаў народу, вядзе антысовецкую агітацыю, накіраваную на падрыў калгасаў.

«Выхаваўчая» дзейнасць Гуціна прахо́дзіць на вачах дубровенскіх кіруючых раённых арганізацый, якія астаюцца спакойнымі наглядальнікамі. Досыць сказаць, што яшчэ 13 лютага на пазіцыуме райвыканкома рашылі, што Гуцін не можа аставацца на пасадзе дырэктара дома. Аднак, рашэнне асталося толькі на паперы.

Характэрна, што сакратар райкома партыі Мышалаў, які добра ведае пра ўсе гэтыя факты, спакойна чакае прыняцця мер з боку намесніка наркома асветы Гершона, які «абяцаў» заняцца справай лядняннскага дзіцячага дома.

Злачынная дзейнасць Гуціна далей непарпіма! Ён павінен быць сурова пакараны за здзекі над дзецьмі.

В. АСТРОЎСКІ.

ПА ГАРАДАХ БССР

ПАРКІ КУЛЬТУРЫ І АДПАЧЫНКУ

БАРЫСАЎ. Нова-Барысаўскі парк культуры і адпачынку да летняга сезона пашыраецца амаль на 3 гектары. Прыступілі на ўжо да пабудовы новай танцавальнай пляцоўкі на плошчы ў 270 квадратных метраў. На алеях далаткова устанаўліваецца 100 новых лавак. Пасаджана 5 тысяч акацый і іншых дэкаратыўных дрэў. Парк будзе мець гукавое кіно, футбольную і галейбольную пляцоўкі, пакоі смеху, карусель, лодкі, качэлі, чытальню і т. д.

Упаралкоўваецца гарадскі парк па Маскоўскай вуліцы. Адкрываюцца буфет, дзіцячая пляцоўка, чытальня і інш. Два разы у тыдзень будуць дэманстравацца кінафільмы. («Большэвік Барысаўшчыны»)

САМАЛЁТЫ У ДАПАМОГУ ПАСЕЎНАЙ

ГОМЕЛЬ. Арганізуюцца вылеты самалётаў у Жаробінскі, Міхалькаўскі, Цярэшкавіцкі і Урыцкі сельсоветы для дапамогі ў пасеўнай кампаніі. У часе вылетаў сярод калгаснікаў будзе праводзіцца агітацыйна-масавая работа па пытаннях барацьбы за рэкордныя ўраджаі і ўзмацнення абароны краіны. Першым рэйсам самалёт вылятае ва Ўрыцкі сельсавет.

ПАБУДАВАНА ПАРАШУТНАЯ ВЫШКА

ПОЛАЦК. На сталінскае імя Варашылава ў Полацку закончана пабудова парашутнай вышкі. Спецыяльная камісія пасля прыёмкі будаўніцтва дазволіла здаць вышку ў эксплаатацыю. Гэтымі днямі з вышкі будуць праведзены пробныя прыжкі. («Большэвік Полаччыны»).

У АТМАСФЕРЫ БЕСКЛАПОТНАСЦІ

Ворагі народу акапаліся і доўгі час школзілі ў ганлёвай сістэме Беларусі. Яны знаходзілі сабе прытулак і ў рознічнай сетцы, і на базах ганлюючых арганізацый, і ў апаратах Белкаапсаюза, Белпромгандля і ў самым Наркамаце ўнутранага ганлю БССР.

Яны карысталіся ратазействам, ідыёцкай бестурботнасцю і палітычнай блізарукасцю кіраўнікоў гэтых арганізацый, якім ускружыў галаву бурны рост таварааабароту, выкліканы рэзкім павелічэннем таварных мас у краіне і ўзлымам матэрыяльнага дабрабыту працоўных. Захапіўшыся высокімі лічбамі таварааабароту, шумнымі парадамі рапартамі і самаўсхваленнем, гэтыя кіраўнікі не зтрывожылі, як ў іх пад носам дзейнічаў класавы вораг.

Ці ўлічылі кіраўнікі ганлёвых арганізацый БССР урокі ўскрытых школніцкіх спраў? Не, не ўлічылі. Факты гавораць аб тым, што ў сістэме дзяржаўнага ганлю БССР, як і раней, панує атмасфера палітычнай бестурботнасці і прытуплення рэвалюцыйнай пільнасці.

Не так даўно органамі НКУС была выкрыта шайка школнікаў і злодзеяў на мясной базе Менхарчгандля, якая ўзначальвалася загалчыкам Янкелевічам. Гэты лоўкі жулік змог увайсці ў давер'е і адурачыць кіраўніка Менхарчгандля тав. Флеера, [illegible] (і нават цяпер яшчэ не змяніў сваёй думкі) Янкелевіча незамянімым спецыялістам і адданым работнікам. Ды ці адзін толькі Флеер! Янкелевіч знаходзіў сабе аўтарытэтных апекуноў і ў Наркамаце ўнутранага ганлю БССР. Асобныя работнікі Наркамата ўнутранага ганлю (Рубін і інш.) сігналізавалі наркому тав. Гуровічу аб злачынных махінацыях Янкелевіча на мясной базе. Але тав. Гуровіч не знайшоў неабходным рэагаваць на гэтыя сігналы, лічачы іх, як відаць, «дробнымі прыдзіркамі».

У Гомелі на адказных пасадах у сістэме дзяржаўнага ганлю сядзелі людзі, якія сістаматычна развальвалі работу. Загалчык гомельскага гарадскога аддзела ўнутранага ганлю Лейбовіч і дырэктар гомельскай канторы Белхарчгандля Бейлін стварылі штучныя перабоі ў продажы хлеба насельніцтву. Аб іх школнай дзейнасці безумоўна не маглі не ведаць дырэктар Белхарчгандля т. Крэйнін і Наркамат унутранага ганлю БССР. Тым не менш яны схамянуліся толькі тады, калі вінаватыя ў зрыве снабжэння насельніцтва хлебам былі ўжо арыштаваны.

Тэта выпадкі мелі месца не ў адным толькі Гомелі. І ў Менску па сістэме Менхарчгандля былі дапушчаны частыя перабоі ў ганлі хлебам і хлеба-булачнымі вырабамі на акраінах горада. Гэтыя перабоі прымушалі жыхароў Серабранкі, пасёлка швейнікаў і інш. ісці за хлебам аж у цэнтр горада.

А што робіцца на базах дзяржаўнага ганлю! Возьмем хоць-бы базу Менхарчгандля, якая знаходзіцца пад самым носам у Наркамата. Паспрабуйце сказаць кіраўнікам Менхарчгандля і Наркамата, што тут мае месца шкодніцтва. Яны ўстануць на дыбы і будуць абураны такім «паклёпам»: «Памілуйце, дырэктар базы тав. Альперовіч бездакорны работнік».

Між тым тут са спакойным сумленнем складваюць на адвае базы пад адкрытым небам, пе абаронеемымі ад дажджу і сонца, дзесяткі тон каштоўных тавараў—капчоныя рыбапрадукты, павідла, варэнне, мыла і інш., загадзя ведаючы, што тавары пасуюцца. На базе парушаюцца элементарныя тэхнічныя правілы хавання цукру, складваючы яго штабелямі вышынёй у 18 мяшкоў, замест устаноўленых 6. Ад такога «хавання» цукар у ніжніх радах мяшкоў сырэе і ператвараецца ў комі.

Чаму Альперовіч так спакойна глядзіць на гэтыя па сутнасці шкодніцкія акты? Ён хаваецца за шырокай спіной нам. дырэктара бакалейна-гастранамічнай канторы Менхарчгандля тав. Гольдзіна і самаго дырэктара Менхарчгандля тав. Флеера. Яны, моў, ведаюць аб гэтым. І сапраўды, Флеер і Гольдзін ведаюць аб «парадках» на базе і легалізуюць іх.

Абураючая вакханалія панує ў планаванні завозу тавараў і ў арганізацыі ганлю. Народны камісарыят унутранага ганлю БССР не ведае і не цікавіцца запатрабаваннямі спажыўца. Работнікі Наркамата ўсё яшчэ не могуць адвыкнуць ад старых, асуджаных металаў механічнага размеркавання тавараў. Яны навязваюць сетцы вясной зімовы асартымент, а зімой летні. Работнікі промтаварнага аддзела Наркамата тт. Кіслік і Лемеш гатовы ўзваліць усю віну на прамысловасць: яна, моў, не лічыцца з асартыментам, з патрабаваннямі спажыўца. Але хто іншы, як не Наркамат унутранага ганлю павінен праглядаць і абараняць інтарэсы спажыўцоў перад прамысловымі арганізацыямі?

А вось некалькі з многіх фактаў школніцкага завозу тавараў у раёны, завозу, загадзя разлічанага на замарожванне тавараабароту, на стварэнне перабояў у ганлі. У Оршу паслалі велізарную партыю талерак, у той час, як імі завалены паліцы магазінаў. У другі раён прыбываюць тысячы чашак, якія месяцамі без руху валяюцца на складах, у той час, як яны патрэбны, напрыклад, Оршы.

У першым квартале бабруйскую базу Белпромгандля, «ашчаслівілі» прысылкай 100 самавараў, у той-жа час Менск не атрымаў ні аднаго. У тым-жа квартале віцебскай базе Белпромгандля адгрузілі 2 вагоны пасуды, а Менску, дзе пасуды нехапае, — толькі адзін. Затое шчодра «частуюць» Менск ніскапробным, бракаваным абуткам. Так, яшчэ ў III квартале мінулага года менская база Белпромгандля атрымала 4,5 тыс. пар мужчынскага абутку, да таго, дрэнная якасці, што з усёй партыі за ўвесь час удалося прадаць толькі... некалькі пар.

Ці адчувае дырэктар Белпромгандля тав. Кантар, ці адчувае Наркамат унутранага ганлю БССР сваю адказнасць за гэтыя агіднасці?

Сярод работнікаў ганлёвай сістэмы, у тым ліку сярод асобных кіруючых работнікаў, пашырана «тэорыя» аб тым, што калі школніцтва магчыма на базах, у аптовых звеннях, у планаванні і арганізацыі ганлю, то яно ніяк немагчыма ў рознічнай сетцы. Гнілая і шкодная тэорыя!

Хіба абмерванне і абважванне спажыўца, продаж недобраякасных, папсаваных прадуктаў, самавольнае павышэнне цэн не ёсць своеасаблівае школніцтва?!

А колькі гэтых фактаў зарэгістравана ў актах дзяржаўнай ганлёвай інспекцыі! Колькі правільных скаргаў спажыўцоў з Жлобіна, Слуцка, Барысава, Гомеля, Віцебска паступаюць штодзённа ў рэдакцыі газет і ў самы Наркамат унутранага ганлю БССР!

А велізарныя растраты па сістэме дзяржаўнага ганлю БССР! Па трох ганлёвых арганізацыях — Менхарчгандлю, Белпромгандлю і Белхарчгандлю сума растрат за 1936 г. перавышае 1 мільён рублёў. Як кваліфікаваць гэта з'явішча?

Аднак кіраўнікі дзяржаўнага ганлю лічаць гэтыя факты «нявінными» і «дробнымі». Яны проста не цікавяцца прыродай гэтых фактаў. Вось, напрыклад, менскі гарадскі аддзел унутранага ганлю. Загалчык аддзела т. Саф'ян цікавіцца фактамі абмервання і абважвання толькі тады, калі яму трэба дзе-небудзь зрабіць даклад. Тады ён пасылае свайго супрацоўніка ў ганлёвую дзяржаўную інспекцыю для атрымання «лічбаў». Сам ён нічога не ведае, што робіцца ў рознічнай сетцы Менска.

Пагрузшы ў ціне бюракратычнай бестурботнасці і дзяляцтва, кіраўнікі Наркамата ўнутранага ганлю і ганлёвых арганізацый БССР адарваліся ад мас, адышлі ад стаханаўскага руху ў ганлёвай сетцы. Справа даходзіць прама да кур'ёзаў, да сапраўдных анекдотаў. Не так даўно праводзілася спаборніцтва ганлёвых работнікаў чатырох гаралоў Саюза. Наркамат унутранага ганлю СССР затрабаваў спісы лепшых магазінаў для прэміравання. І вось у спісу, прадстаўленым для прэміравання менскім гарадскім аддзелам унутранага ганлю і Наркаматам, аказаліся якраз такія магазіны, якія яўна не заслугоўваюць прэміі. Прэміраваны, напрыклад, дырэктар і работнікі магазіна галаўных убораў № 39 Менпромгандля. Калі прэміі былі ўжо раздаены, аказалася, што адбылася прыкрая памылка: замест магазіна № 31 тав. Саф'ян прадставіў для прэміравання магазін № 39.

Прэмію атрымаў таксама дырэктар магазіна № 52 Менхарчгандля Антуловіч. Імённа яго менскі гарадскі аддзел унутранага ганлю і Наркамат рэкамендавалі, як «узорнага дырэктара». А пяпер гэты «ўзорны» работнік аддан пад суд за злоўжыванні.

Дагэтуль у магазіне № 52 красуецца пераходны сцяг Менхарчгандля, хоць апошняму добра вядомы, акрамя злоўжыванняў загадчыка, таксама факты ашукавання спажыўцоў, якія мелі месца ў гэтым «перадавым» магазіне. Так ведаюць кіраўнікі дзяржаўнага ганлю БССР свае кадры, сваю сетку...

У Наркамаце ўнутранага ганлю панує атмасфера палхалімства, запіску самакрытыкі і голага адміністравання.

Бюракратычнае камандаванне культывуецца і ў ніжэйшых звеннях дзяржаўнага ганлю. Калі загадчык хлебнага магазіна № 106 Менхарчгандля тав. Пышкіна паставіла перад дырэктарам хлебафуражнай канторы Хейфецам пытанне аб перабоях у ганлі хлебам, Хейфец нелвусэнсоўна прыразіў: «Буздеце скарэйшца ў органы кантролю, горш будзе».

Такі стыль кіраўніцтва Наркамунутгандля. Гэты стыль парочны. небольшэвіцкі і яго трэба хутка перамагчы.

Е. БУТОМАЎ, С. ГАЛКІН.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

АРАГОНСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 19 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае паведамленне аб становішчы на франтах, у якім гаворыцца, што на арагонскім фронце прасоўванне рэспубліканскіх войск працяжаецца. Рэспубліканцамі занята вёска Альбарасін (на паўночны захад ад Тэруэля).

Рэспубліканцы ўзарвалі масты на чыгуначнай і шасейнай дарогах, якія злучаюць Сарагосу з Валенсіяй.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Рэспубліканскія войскі адбілі на паўднёвым фронце ў раёне Пасабланка атаку мяцежнікаў, атрымаўшых значныя падмацаванні. Рэспубліканцы атакавалі лінію акопаў мяцежнікаў у раёне Обехо (на поўдзень ад Пасабланка) і заняли ўзвышша Фэро даль Мелько.

Самалёты мяцежнікаў бамбардыравалі ўчора ваколіцы Ла Караліна ў правінцыі Хаэн.

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 18 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што ў сектары Эскарыяла (на паўночны захад ад Мадрыда) рэспубліканскія войскі працяжалі ўчора наступаць і пасля нядоўгай бараньбы занялі рад пазіцый мяцежнікаў каля гары Аталайа.

Агенцтва Эспань перадае, што ў часе апошніх баёў у сектары Пуэрча Пуэва (Овіедо — галоўны горад Астурыі) фашысты прывязалі дзяцей да бруствераў траншэй і тым самым прымусілі рэспубліканцаў спыніць агонь. Усе дзеці былі малодзей 10 год. У наступную ноч рэспубліканцам удалося нечаканай атакай авалодаць гэтымі траншэямі, дзе яны знайшлі дзяцей, усё яшчэ прывязаных да бруствераў. Многія дзеці ад страху страцілі розум.

Як паведамляе агенцтва Гавас, урадавая авіяцыя, ўзмоцнена бамбардыравала Тэруэль (арагонскі фронт). Ваенныя аб'екты, у прыватнасці, чыгуначная станцыя, былі зусім разбураны 60 урадавымі самалётамі. У часе паветранага бою былі збіты 5 самалётаў мяцежнікаў тыпу «Фіят».

Бамбардыроўка Барселоны

ПАРЫЖ, 19 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што ўчора два знішчальнікі мяцежнікаў бамбардыравалі барселонскі порт. (Барселона — галоўны горад Каталоніі). Забіта тры і ранёна некалькі чалавек. Насельніцтва, папярэджанае сірэнамі пра паветраную атаку, правяла вялікую вытрымаласць і хладнакроўнасць.

Рэспубліканскія самалёты пагналіся пасустрач знішчальнікам мяцежнікаў і прымусілі іх уцаліцца.

Гэта новая бамбардыроўка выклікала ў горадзе вялікае абурэнне.

Адзінства дзеянняў комуністычнай і соцыялістычнай партый Іспаніі

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 18 красавіка. (БЕЛТА). Цэнтральны камітэт комуністычнай партыі і выканаўчы камітэт соцыялістычнай партыі Іспаніі выступілі з сумесным зваротам аб адзінстве дзеянняў, якое, як падкрэсліваецца ў гэтым дакументе, становіцца з кожным днём усё больш настойлівай необходнасцю ва ўсіх галінах ваеннага і грамадзянскага жыцця.

Гэта — гаворыцца ў звароце — «абавязвае нашы арганізацыі і асобных членаў абодвух партый вырашаць на аснове папярэдніх пагадненняў усе праблемы, якія могуць быць зыходным пунктам для ўсё большага ўмацавання антыфашысцкага блока, для аб'яднання ваенных сіл, якія сумленна змагаюцца за тое, каб выйграць вайну і забяспечыць трыумф рэспублікі.

Устанаўліваючы гэта адзінства дзеянняў у форме пастаянных пагадняльных органаў, мы заяўляем, што ўсе мы падтрымліваем урад народнага фронта. Гэта азначае, што мы будзем актыўна падтрымліваць усе яго пачынанні і з усёй энергіяй будзем садзейнічаць таму, каб ні на фронце, ні ў тылу не мела сілы ніякая ўлада, акрамя ўлады законнага ўрада.

Адзіналушнае наша заданне — скарацінць тэрміны грамадзянскай вайны, — патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл народу, каб кожны садзейнічаў сваімі намаганнямі перамозе. Гэта ажыццяўляецца з тым большым поспехам, калі ў кожным населеным пункце, у кожнай вёсцы нашы арганізацыі будуць дзейнічаць узгоднена, калі кожная з іх у адпаведнасці са сваімі магчымасцямі падначаліць усё інтарэсам ваеннай перамогі, не шкадуючы для гэтага ні намаганняў, ні афяр».

Тэрарыстычныя дзеянні чэхаславацкіх гітлераўцаў

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 19 красавіка. (БЕЛТА). Згодна паведамленню чэхаславацкіх газет, 17 красавіка ў Грунце каля Варнсдорфа (паўночная Чэхія) група генлейнаўцаў (чэхаславацкіх гітлераўцаў) уварвалася на прахадзіўшы там сход нямецкіх соцыял-дэмакратаў і пачала збіваць прысутных. У разультаце 30 чалавек пяжка ранены і адпраўлены ў больніцу.

Генлейнаўцы дзейнічалі пад кіраўніцтвам дэпутата фашысцкай партыі судэцкіх немцаў Рослера. Жандармерыя арыштавала 29 генлейнаўцаў.

Тэрарыстычныя дзеянні чэхаславацкіх гітлераўцаў у Варнсдорфскай акрузе выклікалі вялікае абурэнне сярод рабочых. Газеты патрабуюць ад чэхаславацкага ўрада прыняцця рашучых мер аж да роспуску фашысцкай партыі судэцкіх немцаў.

НАСУСТРАЧ ПЕРШАМУ МАЯ

КІНОСЕАНСЫ НА ПЛОШЧАХ

На плошчах і на ўскраінах гарадоў Менска, Віцебска, Гомеля, Магілева, Бабруйска, Оршы і Барысава 1 і 2 мая будуць наладжаны адкрытыя кіносеансы. У Менску на плошчах глядачы ўбачаць такія вылатныя фільмы, як «Даклад таварыша Сталіна на Надзвычайным VIII з'ездзе Саветаў», «Дэпутат Балтыкі», «Юнацтва Максіма», «Мы з Кранштата», «Чапаеў», «Партыйны білет» і інш.

АБСЛУГОЎВАННЕ ДЭМАНСТРАНТАЎ

18 аўтамашын, 75 цялежак, 183 разносак і латкоў абслужаць дэманстрантаў 1 мая. Гандлюючыя арганізацыі выдзялюць для разноснага гандлю багаты выбар харчовых прадуктаў — кандытарскіх вырабаў, бутэрбродаў, булак, піражных, прахладжальных напіткаў, марожанага і т. д. У асартыменце будуць таксама дробныя прэмтавары — парфумерыя, булаўкі, грабні, стужкі, пацкі і інш.

НАРАДА ПА ПЫТАННЮ ПРАВЯДЗЕННЯ ПЕРША-МАЙСКАГА СВЯТА

Агульнагарадская нарада сакратароў парткомаў, парторгаў, дырэктароў прадпрыемстваў, кіраўнікоў устаноў і старшынь фабзаўмясцкомаў па пытанню аб парадку правядзення першамайскіх свят адбудзецца 21 красавіка г. г. у 7 гадзін увечары ў вялікай зале Дома партактыва.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Гарачыя веснавыя дні ўнеслі ажыўленне ў работу аранжарэй. Ідзе высадка і экіпіроўка кветак для афармлення горада. Аранжарэя № 2 Трэста зялёнага будаўніцтва рыхтуе для афармлення першамайскіх калон звыш 6 тыс. розных кветак. Звыш 800 тыс. каўровых кветак дасць аранжарэя для ўпрыгожання скверaў і садоў горада. НА ЗДЫМКУ: садоўнік аранжарэі т. Хмялеўскі правярае якасць росту кветак, якія рыхтуюцца для афармлення першамайскіх калон.

Фото С. Грына і В. Лейна.

ДАКЛАДЫ АБ 1 МАЯ

Менскі гарком КП(б)Б выдзеліў больш 300 дакладчыкаў, якія зробяць на прадпрыемствах, у аб'яднаных клубах, у навучальных і іншых установах і т. д. даклады аб дні 1 мая.

Па Сталінскаму раёну выдзелена 55 дакладчыкаў, па Варашылаўскаму раёну — 58, па Кагановіцкаму раёну — 65. Па вучэбных і інш. установах — 84.

У ліку дакладчыкаў — наркомы, загадчыкі аддзелаў ЦК КП(б)Б, члены прэзідыума ЦВК БССР, члены ЦК КП(б)Б, Менгаркома КП(б)Б і інш.

ЗАКОНЧЫЎСЯ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГОРСОВЕТА

17 красавіка позна ноччу закончыў сваю работу чарговы пленум Менскага гарадскога совета.

Заслухаўшы і абмеркаваўшы справаздачны даклад тав. Жуковіча аб дзейнасці прэзідыума горсовета за 1936 год, пленум прызнаў яго работу незадавальняючай і ўказаў на тое, што прэзідыум горсовета дагэтуль не прыняў рашучых мер да перабудовы сваёй работы ў адпаведнасці з Сталінскай Канстытуцыяй і рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б). Пленум таксама адзначыў адарванасць прэзідыума ад выбаршчыкаў, палкрэсліў адсутнасць кіраўніцтва работай секцый, дэпутацкіх груп і слабае ўцягненне дэпутатаў у штодзённую практычную работу гарадскога совета.

У рашэннях пленума вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі буйнейшых недахопаў работы горсовета, мерапрыемствы па наладжанню масавай работы і ажыццяўленню задач гаспадарча-культурнага будаўніцтва горада ў адпаведнасці з планам 1937 года і наказам выбаршчыкаў.

Пленум таксама зацвердзіў бюджэт (у суме 58 мільёнаў 353 тысячы рублёў) і план капіталаўкладанняў (у суме 34 мільёны 538 тысяч рублёў) па горсовету на 1937 год. Бюджэт гэтага года ў параўнанні з мінулым узрастае на 16,3 проц. Найбольшую ўдзельную вагу ў бюджэце горада займаюць соцыяльна-культурныя мерапрыемствы (64,6 проц.). У гэтым ліку на вылаткі па народнай асвеце адпускаецца 22 мільёны 378 тысяч рублёў. Значныя сродкі атрымлівае комунальна-жыллёвая гаспадарка горада. На гэту галіну разам з выдаткамі на добрабыт адпускаецца 14 мільёнаў 428 тысяч рублёў.

А. Л.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ДНЯ ДРУКУ

4 лютага г. г. газета «Віцебскі пролетарый» апублікавала зварот рабкораў фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» да ўсіх рабкораў фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» бяруць на сябе абавязацельствы па палепшанню работы нізавога друку, па ўзелу яго ў разгортванні стаханаўскага руху і выкліканюць на соцспаборніцтва ўсе радкалегіі шматтыражак і насценных газет і ўсіх рабселькораў Віцебшчыны паследаваць іх прыкладу.

Гэты зварот знайшоў жывы водгук на прадпрыемствах і ў калгасах Віцебскага раёна. У Ялавінскім сельсавеце быў праведзен спецыяльны партыйны сход, на якім быў зацверджан план падрыхтоўкі да Дня друку, прымацаваны комуністы да калгасаў для правядзення масавай работы і работы нізавога друку. У калгасах «Чырвоная Армія» і імя Гамарніка, гэтага сельсавета, працавалі брыгады па праверцы гатоўнасці гэтых калгасаў да сяўбы.

Зварот рабкораў фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» знайшоў жывы водгук сярод работнікаў нізавога друку і рабкораў фабрыкі «Профінтэрн». У пачатку гэтага месяца рабкоры фабрыкі «Профінтэрн» правялі праверку выканання рабкорамі фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» узятых на сябе абавязацельстваў.

Праверка паказала, што сакратар парткома фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» т. Кавалёў і адказны рэдактар шматтыражкі т. Казанскі дрэнна кіруюць нізавым друкам, не правоцяць належнай работы з рабкорамі. Шматтыражка «Сцяг індустрыялізацыі» мала скарыстоўвае пісьмы сваіх рабкораў. Старонкі газеты запаўняюцца афіцыйнымі матэрыяламі замест таго, каб лепш змяшчаць больш невялікіх цікавых заметак з жыцця фабрыкі, разгарнуць большавіцкую крытыку недахопаў яе работы.

Добры пачын разгортвання масавага соцыялістычнага спаборніцтва рабселькораў і работнікаў нізавога друку ў Віцебскім раёне павінен быць скарыстан для ўзмацнення работы нізавога друку.

О. К.

СУД НАД ЗАБОЙЦАМІ МАСТАКА Ю. М. ПЭНА

ВІЦЕБСК, 19 красавіка. (Кар. «Звязды»). 17 красавіка перад судом прадстала Нэха Файнштэйн, якая разам са сваім братам Абрамам прымала непасрэдны ўдзел у забойстве і абрабаванні мастака Пэна.

Прыкідваючыся пявіным ягнём, яна прабуе подлай і наглай хлуснёй даказаць сваю недатычнасць да злачынства.

У сваіх паказаннях падсудная даходзіць да такой нагласці, што не саромячыся называе зверска забітага ёю мастака, не інакш, як «дарагі дзядзя».

Сёння Нэха адмаўляе свае паказанні на папярэднім следстве і гаворыць, што гэтыя паказанні — хлусня. Яна, маў, аб забойстве і разумення не мае.

На просьбе прадстаўніку абвінавачвання, тут-жа на судзе былі агалошаны паказанні Нэхі і Абрама на папярэднім следстве. У абодвух паказаннях дэталёва выкладаюцца акалічнасці забойства і абрабавання Пэна, як гэта мела месца ў сапраўднасці. Паказанні Абрама і Нэхі ва ўсіх падрабязнасцях поўнасцю пацвярджаюцца актамі судовай і медыцынскай экспертызы.

Прыпёртая да сцяны неадвержнымі ўлікамі, Нэха прымушана была замаўчаць, апусціўшы вочы. Працятвань хлусіць было немэтазгодна: праўда выплыла.

Допыт Нэхі заняў усё вячэрняе пасяджэнне 17 красавіка і ранішняе пасяджэнне 18 красавіка.

Вячэрняе пасяджэнне 18 красавіка пачалося з допыту падсуднай Рывы Саламонік. Як і яе сястра Нэха, Рыва нагла хлусіць. Адзіная, што яна пацвярджае, — гэта факт пасылкі пісьма сваёй матцы ў Ленінград, у якім матцы паведамлялася, што Ўрадавая камісія прыступіла да вопісу прац Пэна.

Не прызнаючы сваёй віны, Рыва адмаўляе свае паказанні на папярэднім следстве, дзе заявіла, што забойства і абрабаванне мастака было зроблена яе братам Абрамам і сястрой Нэхай.

Падсудны Хаім-Шлёма Файнштэйн таксама адмаўляе правільнасць сваіх паказанняў на папярэднім следстве.

У часе яго допыту пракурорам тав. Глезеравым Хаім-Шлёма пацвярджае той факт, што матка яго Лея ўгаварала сваю дачку Нэху выйсці замуж за Пэна, які быццам-бы ў гэтым выпадку абяцаў перапісаць ёй у спадчыну ўсю сваю маемасць.

Пацвярджае і тое, што ён, а таксама Нэха і Абрам сістэматычна абкрадвалі Пэна, а матка іх Лея ў такіх выпадках звычайна гаварыла: «Лепш няхай Пэна абкрадуць свае, чым яго абкрадуць чужыя».

На заданае Леі судом пытанне, ці пацвярджае яна, што атрымлівала ўкрадзеныя ў Пэна грошы, яна, ніколькі не саромячыся, заяўляе:

— Так, я атрымала ад Хаім-Шлёмы 200 рублёў. Ведала, што яны ўкрадзены ў Пэна, але грошы ніхто назад не адбяре.

Дапытваецца падсудны Оліфсон Міхаіл. Ён падрабязна расказвае суду аб сваім знаёмстве з сямействам Файнштэйна. У прыватнасці з Нэхай, 28 лютага ў дзень забойства Пэна ён сапраўды быў у іх на кватэры. Але аб злачынстве ніхто яму нічога не гаварыў.

— Цяпер, — гаворыць падсудны, — я не сумняваюся, што забойства Пэна арабіла сям'я Файнштэйна. Так падрабязна выкласці акалічнасці забойства могуць толькі тыя, хто гэта забойства зрабіў.

Далей Оліфсон паказвае, што 28 лютага ўвечары, калі ён быў на кватэры ў Файнштэйн, Абрам і Нэха вярнуліся дамоў у надзвычайна ўсхваляваным стане.

— Нэха, прывітаўшыся са мною, — прадаўжае ён, — нават не зняла пярчаткі. Тады я гэтаму не надаваў значэння. Цяпер я зразумеў, што іх незвычайная ўсхваляванасць была рэзультатам зробленага імі злачынства.

Оліфсон поўнасцю адмаўляе сваю датычнасць да забойства.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ДЗЕННІК

— Семінар прапагандыстаў гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі сярод беспартыйных адбудзецца 21 красавіка ў 8 гадзін вечара ў партгабінеце Кагановіцкага РК КП(б)Б (дом урада, левае крыло, 5-ты паверх, пакой 501). Тэма заняткаў: вучэнне Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна аб дзяржаве.

Культпроп Кагановіцкага РК КП(б)Б.

— Лекцыя для прапагандыстаў і агітатараў Варашылаўскага раёна на тэму «20-годдзе Красавіцкіх тэзісаў В. І. Леніна» адбудзецца 20 красавіка ў 7 гадзін вечара ў клубе сэфтандальлужачых.

Уваход па партбілетах.

Культпроп Варашылаўскага РК КП(б)Б.

— Чарговыя заняткі загадчыкаў партгабінетаў адбудуцца 21 красавіка ў 9 гадзін 30 мінут раніцы.

— Семінар рэдактароў шматтыражак і насценных газет адбудзецца 21 красавіка ў 7 гадзін вечара (пакой 21).

— Семінар рабочых прапагандыстаў адбудзецца 21 красавіка ў 7 гадзін вечара (пакой 17).

Дом партактыва.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)

20 красавіка Абан. № 85.
КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА

Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

21 красавіка Абан. № 21.
РЫГАЛЕТО

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ТОМ СОЙЕР

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
НАЗАР СТАДОЛЯ

Гукавы кінотэатр «ІНТАРНАЦЫЯНАЛ»
«ВРАТАРЬ»

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ГУДУШКА ГАЛАФЛЕЯ

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 20 КРАСАВІКА:

8.30 — «Апошнія паведамленні». 10.30 — перадача для дзяцей. 12.30 — завочная партвучоба. 16.00 — канцэрт. 18.30 — завочная партвучоба. 19.45 — развучванне песень да першамайскіх свят. 23.00 — «Апошнія паведамленні».

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 21 КРАСАВІКА:

8.30 — «Апошнія паведамленні». 16.00 — канцэрт. 17.00 — развучванне песень для дзяцей. 17.35 — «Апошнія паведамленні». 18.30 — завочная партвучоба. 19.45 — развучванне песень да першамайскіх свят. 20.00 — перадача з дапамогу самадзейнасці. 20.15 — канцэрт яўрэйскай музыкі. 21.00 — перадача на яўрэйскай мове. 22.00 — канцэрт мастацкай самадзейнасці. 23.00 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — перадача на польскай мове.

Калектыў супрацоўнікаў апарата Дзяржплана БССР выказвае сваё спачуванне тав. Г. Д. ЛАПЦЕВУ з прычыны смерці ЯГО МАЦЕРЫ.

Наркомхарчпром БССР

Беларускі дзяржаўны трэст кандытарскай прамысловасці
„БЕЛКМО"
Да свята 1 Мая

Выпусціў спецыяльны дзіцячы ассортымент кандытарскіх вырабаў:

ТАНКІ, АЎТАМАБІЛІ, ВЕТРАНЫЯ МЛЫНЫ, ШПАКОЎНІЦЫ, ПАТЭФОНЫ, КАЛЯСКІ, БАРАБАНЧЫКІ, ГІТАРЫ,
МАНДАЛІНЫ, НАПОЎНЕНЫЯ РОЗНАКАЛЯРОВЫМІ ДРАЖЭ І ШАКАЛАДНЫМІ ЦУКЕРКАМІ, ШАКАЛАДНЫЯ БОМБАЧКІ, ШАКАЛАДНЫЯ ФІГУРКІ І
ІНШ. — НАЙЛЕПШЫХ ГАТУНКАЎ, У СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АРЫГІНАЛЬНАЙ РАСФАСОЎЦЫ І ПА-МАСТАЦКУ АФОРМЛЕНЫЯ.

Патрабуйце дзіцячыя падарункі ва ўсіх магазінах Белкмо, „Союзпрыднага", Белхарчгандля і Менхарчгандля
З НАШАЙ МАРКАЙ.

КУРАНЯТЫ

ВЫСОКАПРАДУКЦЫЯНЫЯ, ЧЫСТАПАРОДНЫЯ
„БЕЛЫ ЛЕГОРН"

ПРАДАЮЦЦА ўсім
У НЕАБМЕЖАВАНАЙ КОЛЬКАСЦІ
не ЗА ГРОШЫ, па цане:
ЧЫСТАПАРОДНЫЯ — 1 р. штука і
МЕТЫСНЫЯ — 85 кап. штука,
таксама і ў АБМЕН НА ЯЙКІ.
За кожнае куранё патрэбна здаць на інкубатарную станцыю 2 яйкі і даплаціць 25 кап.
ВОДПУСК КУРАНЯТ праводзіцца з наступных інкубатарна-птушкаводных станцый
У ГАРАДАХ:
МЕНСК, ІІІС — вул. Апанскага, 58;
ГОМЕЛЬ — Нямецкая, 9;
ОРША — Совецкая, 28;
ПОЛАЦК — Запалоцце, Міхіраўская, 13;
СЛУЦК — вул. Парыжскай Комуны, 43;
КАЛІНКАВІЧЫ — інкубатарная станцыя;
БАБРУЙСК — Цагельная, 8;
БАРЫСАЎ — Роза Люксембург, 11/26;
ЛЕПЕЛЬ — Базарная, 11.
У РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ: Крычаў, Гарадок, Дрыса, Асіповічы, Буда-Кашалёва, Хойнікі, Копысь — калгасная сельсавета, Стара-Копысь — Кастрычнік.
ДАВЕДКІ можна атрымаць: Дом урада, Наркомзем БССР, пакой № 123, тел. 22-605.

Конзаводу № 90
патрабуюцца
садоўнік-гароднік
і прараб-будаўнік.
Аплата на згодзе.
Звяртацца: Церахоўскі раён, конзавод № 90.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНОТЭАТР
Ад 20 красавіка —
новы гукавы мастацкі дзіцячы фільм
„ТОМ СОЙЕР"
па матывах МАРК ТВЭНА.
У праграме—САЮЗКІНОХРОНІКА.
У фае—ДЖАЗ-АРКЕСТР.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА УСІХ УСТАНОЎ, ЯКІЯ АТРЫМЛІВАЮЦЬ ПАЛІВА Ў ГАРТОПЕ, што з 19 красавіка ПАЧЫНАЕЦЦА
ВЫДАЧА УСТАНОВАМ ПАЛІЎНЫХ КНІЖАК
НА 1937/38 АЦЯПЛІЦЕЛЬНЫ СЕЗОН.
ПРЫ АТРЫМАННІ НОВЫХ КНІЖАК НЕАБХОДНА ПРАД'ЯВІЦЬ ДАВЕРАНАСЦЬ УСТАНОВЫ І СТАРУЮ КАРТКУ.
З 25 КРАСАВІКА ВЫДАЧА ПАЛІВА ПА СТАРЫХ КАРТКАХ ПРАВОДЗІЦЦА не БУДЗЕ.
ВЫДАЧА ПРАВОДЗІЦЦА Ў ПАМЯШКАННІ ГАРТОПА, вуліца Калініна, 5, з 5 да 10 гадзін вечара.
АДМІНІСТРАЦЫЯ ГАРТОПА.

УВАГА!
Менская кантора БЕЛПРОМГАНДЛЯ
ДЛЯ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ПАКУПНІКОЎ
У ПРАДСВЯТОЧНЫЯ ПЕРША МАЙСКІЯ ДНІ
З 15 ДА 30 КРАСАВІКА
ПАВЯЛІЧЫЛА ГАДЗІНЫ ГАНДЛЮ
ПА УСІХ МАГАЗІНАХ НА 2 ГАДЗІНЫ.
УСЕ МАГАЗІНЫ ПА ЖАДАННЮ ПАКУПНІКОЎ ДАСТАЎЛЯЮЦЬ КУПЛЕНЫ ТАВАР НА ДОМ БЯСПЛАТНА.
МАГАЗІНЫ ГАРАНТУЮЦЬ ЯКАСЦЬ ТАВАРАЎ.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галоўлітбела № К—2066.

Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63.

Б., К., С.